Падпішыся на «Звязду» і выйграй!

Мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў: «за» і «супраць»

СТАР. 3

Як зменяцца цэны на аўтамабілі

СТАР. 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2014 г. АЎТОРАК № 49 (27659) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«ГЭТЫ ЧЭМПІЯНАТ БУДЗЕ НАЙЛЕПШЫМ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка гарантуе правядзенне ў Мінску лепшага ў гісторыі чэмпіянату свету па хакей. Аб гэтым ён заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея, членам Выканкама МАК Рэнэ Фазелем, паведамляе БЕЛТА.

«Я вам гарантую, што чэмпіянат у Мінску будзе самым лепшым чэмпіянатам у гісторыі. А ён тады такі, калі на трыбунах няма свабодных месцаў. І я хачу запэўніць вас, што ў нас свабодных месцаў на ўсіх матчах не будзе. І я ўпэўнены, што вы будзеце ганарыцца гэтым чэмпіянатам свету», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да госця.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Рэнэ Фазель уклаў нямала сваёй працы ў падрыхтоўку да гэтага першынства. «Вы тут пастаянна бывалі, падказвалі, раілі, накіроўвалі работу ў тое рэчышча, у якое патрэбна было», — сказаў Прэзідэнт. Ён выказаў удзячнасць асабіста Рэнэ Фазелю і яго калегам за тую каласальную работу і падтрымку, аказаныя Беларусі ў гэты прамежак часу.

Прэзідэнт Беларусі таксама падзякаваў Рэнэ Фазелю за мужнасць, якую ён асабіста і Міжнародная федэрацыя хакея праявілі ў адносінах да Беларусі і чэмпіянату свету, які будзе праведзены ў Мінску. «Я вельмі добра ведаю, які быў націск на міжнародную федэрацыю. І вы самі адчувалі такі ж націск. У нас хакеісты проста ганарацца прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі хакея: бачыце, вось гэта сапраўдны мужык, сказаў, што спорт па-за палітыкай, значыць, па-за палітыкай, прынята рашэнне ў Мінску праводзіць чэмпіянат, значыць, будзем праводзіць у Мінску», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«І як бы ні націскалі, я шчыра кажу, нават засумняваўся, калі быў жудасны націск: думаю, няўжо Рэнэ здасца, адыдзе ад гэтых пазіцый, але вытрымаў. Я табе вельмі ўдзячны за гэта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея.

У сваю чаргу Рэнэ Фазель прызнаў, што быў пэўны націск на федэрацыю. «Але наша пазіцыя адназначная: мы аддзяляем спорт ад палітыкі, і яна засталася нязменнай», — сказаў ён. Рэнэ Фазель таксама выказаў упэўненасць, што ў Мінску будзе праведзены цудоўны чэмпіянат і яго госці атрымаюць задавальненне ад гасціннасці і цеплыні беларускага народа, а таксама цудоўнага спартыўнага мерапрыемства.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Мінск гатовы да прыёму чэмпіянату: былі пабудаваны самыя сучасныя палацы, у якіх будуць праходзіць спаборніцтвы, дастаткова дадатковых пляцовак, дзе можна будзе трэніравацца ў любы час сутак, створана неабходная інфраструктура. Акрамя таго, арганізаваны бязвізавы ўезд у краіну па білеце, купленым на любы з матчаў чэмпіянату. «Мы поўнасцю адкрываем для нашых гасцей краіну, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы зрабілі ўсё, каб і вам не было сорамна, і госці паглядзелі на нашу краіну».

Рэнэ Фазель у якасці падарунка паднёс Аляксандру Лукашэнку калекцыйныя шайбы Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў у Сочы.

Фотаздымкі БЕЛТА

ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Веснавыя палявыя работы ідуць у ААТ «Гарадзец-Агра» Кобрынскага раёна. З 2 тысяч гектараў, прызначаных для яравых збожжавых культур, ужо засеяна палова. А ўсяго ў гэтай гаспадарцы трэба будзе заняць яравымі больш за 4 тысячы гектараў. Адначасова ў глебу ўносіцца арганіка, вадкім азотам угнойваюць усходы азімых культур, плантацыі рапсу.

На здымку: механізатар Сяргей ЗАНОЎСКІ і начальнік вытворчага ўчастка № 1 Мікалай ВЯРЭНІЧ на полі, гатовым для сяўбы.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ШЫМАЎ, рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта:

«Праект новай рэдакцыі правіл прыёму ў ВНУ і ССНУ зробіць уступную кампанію больш празрыстай. Прынцыповых змен не чакаецца, аднак будуць новаўвядзенні, якія палегчаць паступленне для абітурыентаў. У прыватнасці, хутчэй за ўсё, адмовімся ад адбору па гарадзе і вёсцы — будзе адзіны конкурс. Мы сутыкнуліся з праблемай набору на аграрныя спецыяльнасці і педагагічныя. Тут будуць некаторыя моманты, якія палегчаць паступленне абітурыентаў на гэтыя спецыяльнасці. Што тычыцца, напрыклад, педагагічных спецыяльнасцяў, то, дзякуючы новым правілам, абітурыенцкая эліта будзе арыентавана на педагагічную адукацыю, што з'яўляецца асновай асноў, бо разумны і здольны настаўнік — залог добрай адукацыі ў цэлым па краіне».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.03.2014 г.

Долар ЗША	9820,00	■
Еўра	13640,00	▲
Рас. руб.	268,00	■
Укр. грыўня	986,93	▼

РАЗГЛЕДЖАНЫ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 17 сакавіка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Варанковіча Уладзіміра Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Кіпр па сумяшчальніцтве;

Прыму Віталя Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Непал па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

Мулярчыка Андрэя Уладзіміравіча — старшынёй Пінскага гарвыканкама;

Анішчыка Уладзіміра Сяргеевіча — старшынёй Свіслацкага райвыканкама;

Кота Віктара Іосіфавіча — старшынёй Вілейскага райвыканкама;

Малашэнкі Дзмітрыя Віктаравіча — старшынёй Касцюковіцкага райвыканкама;

Саскевіча Паўла Аляксандравіча — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія»;

Ягорава Аляксея Уладзіміравіча — рэктарам установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»;

Гракуна Уладзіміра Уладзіміравіча — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання;

Прывалава Уладзіміра Аляксандравіча — намеснікам міністра спорту і турызму;

Кійко Дзмітрыя Мікалаевіча — намеснікам міністра фінансаў;

Раманоўскага Аляксандра Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод «Белалка»;

СТАР. 2

■ 18 сакавіка — Дзень унутраных войскаў

ПРАФЕСІЯ, ЯКУЮ ВЫБІРАЮЦЬ СЭРЦАМ

Напярэдадні прафесійнага свята на тэрыторыі адной з вайсковых часцей Міністэрства ўнутраных спраў прадстаўнікі элітнага падраздзялення прадэманстравалі сваю асабістую вывучку і боегатоўнасць. Паказальныя выступленні роты ганаровай варты, паказальныя заняткі па рукапашным баі і па тактыцы агульнавайсковага бою роты спецыяльнага прызначэння, дэфіле аўтамабільнай брыгады заставілі ахаць і охаць усіх прысутных. А разам з тым пераканацца ў прафесіяналізме тых, хто днём і ноччу падтрымлівае правапарадак і бяспеку ў нашай краіне.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў разам з супрацоўнікамі органаў унураных спраў забяспечваюць спакой на вуліцах гарадоў, бяспеку на грамадска-палітычных і культурна-відовішчных мерапрыемствах, пачынаючы ад міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і заканчваючы звычайным футбольным матчам.

Ад прафесіяналізму прадстаўнікоў унутраных войскаў залежыць надзейнасць аховы выпраўленчых устаноў і асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў. Падраздзяленні па канваіраванню забяспечваюць паспяховае функцыянаванне судовых і следчых органаў рэспублікі. Спецыялісты сапёрна-піратэхнічных структур, рызыкуючы сваім жыццём, абязшкоджваюць выбухованебяспечныя прадметы. Менавіта ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў будуць забяспечваць ахову і правапарадак на Беларускай АЭС.

СТАР. 2

■ Надвор'е

РАЗВІТАННЕ З АПОШНІМ СНЕГАМ?

У пятніцу на поўдні прагназуецца да 18 цяпла

У мінулыя выхадныя рэзкую змену надвор'я на тэрыторыю Беларусі прынёс Атлантычны цыклон, услед за якім да нас пачалі паступаць халодныя паветраныя масы з боку Скандынаўскага паўвострава, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.

Уплыў гэтага цыклона захаваецца і ў аўторак. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ўсяго 0-6 цяпла, а па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — каля плюс 8 градусаў. Чарговы халодны цыклон завітае на тэрыторыю краіны з боку Нарвежскага мора ўжо ў сераду. Будзе воблачна, амаль паўсюдна часам прагназуецца дождж, а па паўночным усходзе — дождж з мокрым снегам. Вецер заходні з парывамі да 15-18 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях да 5 марозу, удзень на поўначы 1-3 цяпла, а на поўдні краіны — да плюс 7-9 градусаў.

Сіноптыкі прагназуюць, што ў чацвер надвор'е ў нас зноў рэзка зменіцца: пацяплее. На тэрыторыю Беларусі завітае цяпло з боку паўднёвых шырот. Паўсюдна чакаюцца дажджы. Тэмпература паветра ўначы яшчэ ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — 2-7 цяпла, аднак па паўднёвым захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей ўначы чакаецца да плюс 5, а ўдзень прыгрэе нават да плюс 9-12 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу цяпло «накрые» ўжо ўсю тэрыторыю краіны. Уначы стане 0 — плюс 5 градусаў, максімальная тэмпература паветра ўдзень — 9-15, а па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — да плюс 16-18 градусаў. Захаваецца цёплае і камфортнае надвор'е і ў суботу. Тады кароткачасовыя дажджы прагназуюцца толькі па паўночным захадзе Беларусі, дзе магчымы нават першыя веснавыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі туман. Праўда такая анамальная цеплыня будзе радаваць нас толькі два дні. У нядзелю да нас прыйдзе чарговы атмасферны фронт і пасвяжэе... Гэта і не дзіўна — на дварэ сакавік.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КРЫМ АБВЯСЦІЎ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Парламент Крыма абвясціў паўвостраў незалежнай дзяржавай. У пастанове, прынятай дэпутатамі на пазачарговай сесіі 17 сакавіка, адзначаецца, што з гэтага дня на тэрыторыі паўвострава перастаюць дзейнічаць украінскія законы і дзяржаўныя органы Украіны, а дзяржаўная ўласнасць Украіны пераходзіць у распараджэнне Крыма. Абвяшчэнне незалежнасці, нагадаем, прадугледжвалася дэкларацыяй, прынятай дэпутатамі незадоўга да рэферэндуму аб уз'яднанні з Расіяй. Пасля аб'явы аб новым статусе, згодна з дакументам, Крым звернецца да РФ з афіцыйнай просьбай аб далучэнні ў якасці суб'екта федэрацыі.

Вынікі рэферэндуму 17 сакавіка зацвердзіў таксама гарадскі савет Севастопаля, дзе рэферэндум праводзіўся асобна. Большасць з тых, хто галасаваў, таксама выступіла за далучэнне да РФ. Рэферэндум у Крыме адбыўся 16 сакавіка. Па афіцыйных звестках, больш за 96 працэнтаў тых, хто ўдзельнічаў у галасаванні, выказаліся за далучэнне да РФ. Улады Украіны лічаць плебісцыт незаконным. Тым часам стала вядома, што прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін 18 сакавіка выступіць перад расійскімі парламентарыямі і кіраўнікамі рэгіёнаў у сувязі з рэферэндумам у Крыме.

СІСТЭМЫ СУВЯЗІ ЗНІКЛАГА «БОІНГА» БЫЛІ АДКЛЮЧАНЫ ЎРУЧНУЮ

Сістэмы сувязі самалёта «Боінг-777» авіякампаніі Malaysia Airlines, які прапаў з радараў 8 сакавіка, былі адключаны ўручную. Як паведаміў міністр абароны і выканаўца абавязкаў міністра транспарту Малайзіі Хісхамудзін Хусейн, сістэма сувязі ACARS (адрасна-справаздачная сістэма авіяцыйнай сувязі) была адключана праз 40 хвілін пасля ўзлёту кімсьці на борце самалёта. Праз 14 хвілін быў адключаны прыёмаперадатчык, які выкарыстоўваецца для ідэнтыфікацыі самалёта радарамі. Хусейн таксама паведаміў, што апошні сеанс сувязі паміж пілотамі і дыспетчарамі адбыўся ўжо пасля адключэння ACARS. Гэта былі словы «Добра, дабранач», сказаныя кімсьці з пілотаў. Спецыялісты адзначаюць, што падобнае нефармальнае развітанне супярэчыць звычайнай практыцы, згодна з якой пілот павінен зачытаць інструкцыі для сувязі з наступным дыспетчарскім цэнтрам і назваць пазыўны самалёта.

5 ЗАМОЖНЫХ СЕМ'ЯЎ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ БАГАЦЕЙШЫЯ ЗА 20% НАСЕЛЬНІЦТВА КРАІНЫ

Багацце пяці самых багатых сем'яў Вялікабрытаніі перавышае бюджэт 20% бяднейшага насельніцтва краіны. Па звестках дабрачыннай арганізацыі Oxfam, на сённяшні дзень капітал пяці самых багатых сем'яў у каралеўстве ацэньваецца амаль у $47 млрд, што вышэй, чым сукупныя сродкі 12,6 млн брытанцаў. У той час як даходы эліты актыўна растуць, мільёны сем'яў спрабуюць канцы стачыць, адзначаюць у Oxfam. Такое становішча спраў прыводзіць да таго, што Вялікабрытанія ператвараецца ў расколатую нацыю. Для вырашэння праблемы спецыялісты заклікалі ўрад Вялікабрытаніі засяродзіцца не на праблемах ухілення ад выплаты падаткаў, а на павышэнні падаткаў на раскошу.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЫЕТОЛАГІ НАЗВАЛІ БАНАНЫ СУПЕРПРАДУКТАМ

Вядома, што бананы з'яўляюцца выдатнай крыніцай калію. А гэты элемент дапамагае рэгуляваць крывяны ціск і пазітыўна адбіваецца на стане касцявой сістэмы, піша The Times Індыі. Калій дапамагае спыніць вымыванне кальцыю, зніжаючы рызыку астапарозу і павышанай ломкасці касцей у пажылых людзей. Таксама бананы багатыя на клятчатку, неабходную для нармальнага функцыянавання стрававальнай сістэмы. Яшчэ бананы аблягчаюць сімптомы пякоткі. Чарговы «плюс»: у бананах высокая канцэнтрацыя вітаміну B_6. А значыць, яны спрыяюць выпрацоўцы крыві. Вітамін С, магній, марганец, якія ўваходзяць у састаў банана, умацоўваюць імунітэт. Бананы засцерагаюць і ад язвы страўніка. Да таго ж «суперпрадукт» пазітыўна ўплывае на настрой і зніжае ўзровень стрэсу.

КАРОТКА

Паказы новых калекцый адзення і абутку будуць арганізаваны ў час работы міжнароднай выстаўкі-кірмашу «Белтэкслегпрам. Вясна», якая намечана на 25-27 сакавіка ў Мінску.

Інфляцыя ў краінах Мытнага саюза ў студзені-лютым гэтага года склала 1,5 працэнта і зменшылася на 0,2 працэнтнага пункта ў параўнанні са студзенем-лютым 2013 года.

У Мінску на 1,8 працэнта павялічаны тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва, якія субсідзіруюцца дзяржавай, з улікам індэксацыі.

У 2013 годзе мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» наведалі 387 тыс. чалавек. А 22 чэрвеня ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой» будзе адкрыта музейная экспазіцыя пад назвай «Музей вайны — тэрыторыя міру».

Адзінаццацікласнік памёр на ўроку фізкультуры адной са школ Пінска. Ён гуляў у футбол з аднакласнікамі і адчуў сябе дрэнна. Выкладчыкам была выклікана брыгада хуткай медыцынскай дапамогі, якая па прыбыцці канстатавала смерць юнака. Прычына смерці высвятляецца.

ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

сакавік 18–22

Датэрміновае галасаванне на мясцовых выбарах у Беларусі пройдзе **з 18 па 22 сакавіка.**

Час работы ўчастка*:
10.00 – 14.00
16.00 – 19.00

ПРАГАЛАСАВАЦЬ ДАТЭРМІНОВА МОЖА ЛЮБЫ ВЫБАРШЧЫК БЕЗ ТЛУМАЧЭННЯ ПРЫЧЫНЫ, ПРЫ НАЯЎНАСЦІ АДНАГО З НАСТУПНЫХ ДАКУМЕНТАЎ:

- пашпарта,
- вадзіцельскага пасведчання,
- ваеннага білета (для ваеннаслужачых тэрміновай службы),
- пенсійнага пасведчання (пры наяўнасці ў ім фатаграфіі),
- студэнцкага білета,
- службовага пасведчання дзяржаўнага служачага,
- даведкі органаў унутраных спраў (для грамадзян, якія страцілі пашпарт),
- пасведчання на права жыхарства (для грамадзян Расіі, якія пастаянна пражываюць у краіне).

ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У ВЫБАРАХ У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСІ Ў КРАІНЕ ПЛАНУЮЦЬ 73 % ВЫБАРШЧЫКАЎ.**

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ – 23 САКАВІКА.

**Выключэнне складаюць участкі, якія ўтвораны ў воінскіх часцях, санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах.*

***Паводле даных апытання, прыведзенага тэлеканалам "Беларусь-1".*

Крыніца: ЦВК Беларусі. © Інфаграфіка БЕЛТА

РАЗГЛЕДЖАНЫ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ангерчыка Міхаіла Аляксандравіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Маладзечанскі завод металаканструкцый»;

Філімонава Міхаіла Васільевіча — генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларуская атамная электрастанцыя»;

Когута Віктара Рыгоравіча — намеснікам Генеральнага сакратара Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў — прадстаўніком Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, прадстаўніком Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва;

Пішч Святланы Сяргееўны — намеснікам начальніка Апарату Прадстаўніцтва Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Рэспубліцы Беларусь;

Мазуркевіча Максіма Анатольевіча — намеснікам начальніка Галоўнага арганізацыйнага ўпраўлення Сакратарыята Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Размаўляючы з новымі кіраўнікамі мясцовых выканаўчых органаў, Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся тым, як ідуць справы ў раёнах і якія ўзнікаюць праблемы. Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на неабходнасці выхаду на эфектыўную вытворчасць, у тым ліку ў сельскай гаспадарцы, і папярэдзіў, што лёгкага жыцця і вялікіх аб'ёмаў дзяржаўнай падтрымкі чакаць не трэба.

«Сельскую гаспадарку трэба прыводзіць да прытомнасці. Мы не можам так фінансаваць і падтрымліваць вёску, як раней. Па розных прычынах. У нас ёсць пэўныя абавязацельствы і ў Мытным саюзе, — сказаў Прэзідэнт. — Па-другое, у нас ужо намецілася нейкая тэндэнцыя да ўтрыманства. Мы ж з вамі працавалі ў сельскай гаспадарцы, вы ведаеце: прасі больш, дадуць крыху менш».

«Цяпер на чале з прэм'ер-міністрам актыўна працуе група па вёсцы. У бліжэйшы час мы выйдзем на пэўныя рэкамендацыі, вывучыўшы сітуацыю прыкладна так, як было па будаўніцтве», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Але меры адны: пара ўжо зарабляць. Недзе мацнейшая гаспадарка, недзе слабейшая. Старшыня райвыканкама ў гэтай сітуацыі становіцца нейкім вузлавым звяном для развязкі праблем і кіравання ўсім комплексам», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу кіраўнікоў мясцовай вертыкалі ўлады, што ўсе прадпрыемствы на тэрыторыі раёнаў, незалежна ад формы ўласнасці, знаходзяцца ў іх зоне адказнасці. «Якое б там прадпрыемства ні было — прыватнае, дзяржаўнай формы ўласнасці, акцыянернае таварыства — вы за гэта адказваеце. Таму што там працуюць нашы людзі, за якіх вы несяце адказнасць. Па-другое, там падатковая база, а падаткі — гэта жыццё дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар.

У гэтым плане Прэзідэнт выказаў долю крытыкі ў адрас тых старшынь выканкамаў, якія самаўхіляюцца і не ўнікаюць у праблемы прыватных прадпрыемстваў, і запатрабаваў строга кантраляваць адпаведныя пытанні. «Гэта правы чалавека. Права на працу, на яе перспектыву. Ён павінен бачыць перспектыву, што ён будзе пастаянна працаваць і карміць сваю сям'ю», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Асобна Аляксандр Лукашэнка згадаў аб кадравай рабоце і падтрыманні дысцыпліны. Ён запатрабаваў не дапускаць фактаў перасаджвання чыноўнікаў і кіраўнікоў, якія правалілі сваю работу, на іншыя «цёплыя» месцы. «Тут лодарнічаў, а вы яго ціхенька перавялі на іншую пасаду. Гэтага не павінна быць, — сказаў Прэзідэнт. — Кадры павінны разумець: працуеш — хвала і пашана, праваліў па сваёй віне — мы не супраць таго, каб ты працаваў, але калі ты, акрамя мятлы, нічога не ўмееш рабіць, — бяры мятлу, калі ты настаўнік — выкладай у школе, калі ты інжынер па спецыяльнасці — ідзі майстрам у сельгастэхніку або яшчэ куды-небудзь».

«Калі мы гэта не выкаранім — будзе тое ж самае, што карупцыя. Яны павінны адчуваць адказнасць. На гэтыя пытанні трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама запатрабаваў ад Адміністрацыі Прэзідэнта пастаянна трымаць адпаведныя пытанні на кантролі па ўсёй вертыкалі ўлады.

Грунтоўная размова ў Прэзідэнта адбылася і з новымі кіраўнікамі вышэйшых навучальных установ. Аляксандр Лукашэнка цікавіўся станам матэрыяльна-тэхнічнай базы ВНУ, якасцю прафесарска-выкладчыцкага складу, работай па наборы студэнтаў.

■ Ва ўрадзе

З УВАГАЙ ДА ВЕТЭРАНАЎ НЕ ТОЛЬКІ НАПЯРЭДАДНІ ПАМЯТНЫХ ДАТ

Учора ў Савеце Міністраў адбылося другое пасяджэнне Рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

ФАКТАР КАНСАЛІДАЦЫІ

Яшчэ 20 мая 2013 года кіраўнік дзяржавы падпісаў Указ № 230 аб стварэнні гэтага камітэта і святкаванні знамянальных дат. У ім запланавана вялікая колькасць шматлікіх мерапрыемстваў і акцый, якія чакаюць ветэранаў і ўсіх грамадзян нашай краіны. «Падрыхтоўка да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне разглядаецца як магутны фактар кансалідацыі беларускага грамадства, даніна павагі і ўдзячнасці ўдзельнікам вайны за іх асабісты ўклад у вялікую Перамогу», — падкрэсліў **прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** Паводле яго слоў, у краіне праведзена ўжо большая частка мерапрыемстваў гэтай вялікай і важнай працы. Аднак і кіраўнік урада, і **старшыня Беларускага саюза афіцэраў, генерал-лейтэнант у адстаўцы Яўген МІКУЛЬЧЫК,** перасцерагаюць ад таго, каб клопат аб ветэранах станавіўся «абавязалаўкай». «Важна бачыць за сухімі лічбамі статыстыкі канкрэтнага жывога чалавека, ветэрана, акружыць яго ўвагай не толькі напярэдадні гэтай знамянальнай даты, але і ў прынцыпе імкнуцца па магчымасці вырашаць пытанні, задачы, якія стаяць перад гэтымі пажылымі людзьмі, іх сем'ямі», — заявіў прэм'ер.

ГЕРОІ АТРЫМАЮЦЬ ПА 10 МІЛЬЁНАЎ

Сёння ў Беларусі пражывае 21 тысяча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 10770 з якіх — яе непасрэдныя ўдзельнікі. Па рашэнні ўрада і ў адпаведнасці з рашэннем аргкамітэта, на асаблівым кантролі органаў улады знаходзіцца сацыяльная лячэбна-прафілактычная і рэабілітацыйная работа, накіраваная на задавальненне іх патрэб. Толькі летась санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне прайшлі 2,5 тысячы ўдзельнікаў ВАВ, стацыянарнае лячэнне — больш за 11 тысяч чалавек. Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што 29 студзеня Прэзідэнт падпісаў Указ № 54 «Аб аказанні аднаразовай матэрыяльнай дапамогі». Згодна з ім, у сувязі са святкаваннем 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў грашовая падтрымка будзе аказана ўсім ветэранам, а таксама асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Героям Савецкага Саюза, асобам, узнагароджаным ордэнамі Славы трох ступеняў, а таксама Героям Сацыялістычнай Працы, якія ўдастоены гэтых высокіх званняў за заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, будзе выдзелена матдапамога ў памеры 10 млн рублёў. Вызначаны памеры адпаведных выплат інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія прымалі ўдзел у складзе спецфарміраванняў, а таксама іншым катэгорыям удзельнікаў ВАВ.

Агульныя выдаткі на аказанне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з гэтым указам складуць 263 млрд рублёў. «Гэтыя сродкі ў нас ёсць», — адзначыў прэм'ер-міністр. Выплаты будуць праводзіцца па месцы выплаты пенсій з 1 чэрвеня па 1 ліпеня 2014 года.

НА ЮБІЛЕЙНЫЯ МЕДАЛІ — 5 МЛРД РУБЛЁЎ

Міністр абароны Юрый Жадобін далажыў аб ходзе выканання ведамствам плана мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да правядзення і святкавання знамянальных дат. Паводле яго слоў, усе плануемыя мерапрыемствы міністэрства выканала. Расказаў міністр і пра выраб юбілейных медалёў — «70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» і «70 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў». Праца ідзе па плане, і агулам на выраб медалёў спатрэбіцца 5 млрд рублёў. «З фінансаваннем праблем няма», — заявіў міністр абароны.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

«Мы — грамадзяне Беларусі»

Мінскім 16-гадовым выдатнікам вучобы ў Дзень Канстытуцыі былі ўручаны пашпарты. Акцыя з уручэннем першага ў жыцці дакумента «Мы — грамадзяне Беларусі» прайшла ў зале пасяджэнняў рэспубліканскага савета РГА «Белая Русь». Лепшых прадстаўнікоў сталічнай моладзі прадстаўлялі ўдзельнікі навукова-практычных канферэнцый, пераможцы і прызёры рэспубліканскіх спаборніцтваў, фестываляў, конкурсаў, прадметных алімпіяд. Ва ўрачыстай абстаноўцы юнакі і дзяўчаты атрымалі пашпарты з рук намеснікаў старшыні «Белай Русі» Аляксандра Шацько і Сяргея Пігарава.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«ДРОБЯЗЬ» ВЫХОДЗІЦЬ З АБАРАЧЭННЯ

Нацыянальны банк нагадвае, што заканчваецца перыяд абмену банкнот наміналам 10 і 20 рублёў узору 2000 года, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў ведамства.

Па 31 сакавіка 2014 года ўключна абмяняць банкноты гэтых наміналаў яшчэ можна без абмежаванняў і без спагнання камісійнага ўзнагароджання ў любой суме, роўнай 50 рублям, у структурных падраздзяленнях Нацбанка. З 1 красавіка банкноты наміналам 10 і 20 рублёў будуць выключаныя са звароту і лічыцца несапраўднымі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

АДЗНАЧЫЛІ ЛЕПШЫХ

15 жыхароў Магілёўшчыны атрымалі спецыяльныя прэміі аблвыканкама «Чалавек года».

Яе ўдастоіліся заслужаныя прадстаўнікі розных прафесій, якія дабіліся высокіх вынікаў у сваёй працы за мінулы год.

— На Магілёўшчыне шмат чаго робіцца для развіцця сацыяльнай сферы, эканомікі, міжрэгіянальных і міжнародных адносін, — адзначыў у сваім віншавальным слове **старшыня аблвыканкама Пётр РУДНІК.** — І вялікі дзякуй тым людзям, якія ўнеслі ў агульную справу свой уклад.

Прэмія «Чалавек года» прысуджаецца па трох напрамках дзейнасці — вытворчай, невытворчай і грамадска-палітычнай. Сярод тых, хто атрымаў яе ў гэты раз, старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза жанчын Раіса Лычкоўская, дырэктар абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду Ірына Фісюк, загадчык аддзялення кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў Дрыбінскага раённага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва Мікалай Куляшоў і іншыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

АДРАЗУ ТРЫ РЫБАКІ — ПАД ЛЁД

У Аршанскім раёне ў гарадскім пасёлку Арэхаўск адразу тры рыбакі праваліліся пад лёд.

— Днём на возеры Вялікае Арэхаўскае на адлегласці прыкладна 50 метраў ад берага работнікі МНС выратавалі двух рыбакоў — абодва работнікі лакаматыўнага дэпо станцыі «Орша». Выратаваныя з дыягназам «пераахаладжэнне арганізма» былі перададзеныя работнікам хуткай медыцынскай дапамогі і дастаўлены ў Аршанскую гарадскую бальніцу № 1. Яшчэ адзін рыбак патануў. Яго цела толькі на наступны дзень выцягнулі з вады супрацоўнікі таварыства выратавання на водах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЧАРГОВЫ ЧЫНОЎНІК — ЧАРГОВЫ ХАБАР

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі падчас атрымання хабару загадчыка сектара Мінскага абласнога агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

Паводле слоў кіраўніка прэс-службы КДБ Артура Стрэха, незаконнае грашовае ўзнагароджанне ў памеры 1200 долараў чыноўнік атрымаў ад прадстаўніка аднаго са сталічных ЖБСК. Апошні такім чынам аддзячыў за дапамогу ў рэгістрацыі будаўніцтва шматкватэрнага жылога дома.

У дачыненні да затрыманага ўпраўленне КДБ па Мінску і Мінскай вобласці распачало крымінальную справу.

Надзея ПАЎЛАВА.

БЫВАЙ, КАЛЕГА...

Сваё жыццё Вольга Шаўко прысвяціла журналістыцы. Спачатку працавала ў «Чырвонай змене», далей — у «Беларускім часе», потым зноў вярнулася ў «Чырвонку», адкуль — з пасады намесніка галоўнага рэдактара — у 2002 годзе прыйшла ў «Звязду» і ўзначаліла аддзел уласных карэспандэнтаў.

Адкрытая і спагадлівая, Вольга заўсёды шчыра клапацілася пра тых, хто меў у гэтым патрэбу, у тым ліку і пра сваіх падначаленых. Дапамагала і словам, і справай. У яе не было любімчыкаў, «лепшых» і «горшых» — былі людзі, якія мелі патрэбу ў падтрымцы і дапамозе.

Вольга была сапраўды неабыякавым чалавекам, востра ўспрымала любую несправядлівасць і ніколі не маўчала, калі нехта адступаўся ад прынцыпаў або паводзіў сябе непрыстойна.

А яшчэ яна ўмела сябраваць — дзверы яе дома заўсёды былі адчынены для ўсіх… Была клапатлівай мамай для любімай дачкі, душы не чула ва ўнучках…

Супрацоўнікі газеты «Звязда», усе, хто ведаў і памятае Вольгу, глыбока смуткуюць у сувязі з яе заўчаснай смерцю і выказваюць словы шчырага спачування родным і блізкім.

Звяздоўцы.

У ЧЫМ СЛАБАСЦЬ ПАРТЫЙ?

Падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА Ігар Катляроў, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар, заявіў, што актыўнасць партый на выбарах у мясцовыя Саветы недастатковая.

Дырэктар Інстытута сацыялогіі паведаміў, што ад агульнай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў прадстаўнікі палітычных партый складаюць толькі 3%. Па яго словах, для пераходу на прапарцыянальную сістэму на выбарах у Беларусі неабходна, каб усе 100% былі партыйнымі кандыдатамі. «Дзе ж мы возьмем яшчэ 97%, калі будзе пераход на прапарцыянальную сістэму або на выбары па партыйных спісах?» — заўважыў Ігар Катляроў. Прафесар лічыць, што ў цэлым па краіне палітычныя партыі вельмі слабыя. «Усяго іх 15, а рэйтынг нават самай лепшай з іх — у межах сацыялагічнай памылкі, гэта значыць плюс-мінус 1%», — адзначыў сацыёлаг. Прычыны гэтага ён бачыць перш за ўсё ў тым, што партыі не маюць свайго твару, не могуць выразна і зразумела сказаць, чаго яны хочуць. Акрамя таго, на думку Катлярова, у партый няма цікавых палітычных ідэй.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ПРАФЕСІЯ, ЯКУЮ ВЫБІРАЮЦЬ СЭРЦАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Прадстаўнікі ўнутраных войскаў — людзі, якія выбралі прафесію па сэрцы, якія марылі сюды трапіць, — расказаў **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі палкоўнік Алег БЕЛЯКОЎ.** — Вядома, аднаго жадання тут мала: патрэбна выдатнае здароўе, выдатная фізічная падрыхтоўка. Аб прэстыжы прафесіі сведчыць хаця б тое, што, калі пачынаецца адбор падчас прызыўных камісій, то сюды трапляюць лепшыя з лепшых. А на факультэт унутраных войскаў Акадэміі МУС ніколі не бывае недабору.

Сёлета прадстаўнікоў унутраных войскаў чакае яшчэ адзін адказны экзамен. Менавіта на гэтых спецыялістах ляжыць адказнасць за бяспеку на чэмпіянаце свету па хакеі, які пройдзе ў Мінску.

— Унутраныя войскі і іншыя сілавыя структуры актыўна рыхтуюцца да працы падчас сусветнага першынства: правоdзяцца трэніроўкі, адпрацоўваюцца дзеянні на выпадак узнікнення надзвычайных сітуацый, эвакуацыі заўзятараў, фанацкіх беспарадкаў, — зазначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі — камандуючы ўнутранымі войскамі генерал-маёр Юрый КАРАЕЎ.** — Афіцэры ўнутраных войскаў прайшлі курсы англійскай мовы і змогуць на побытавым узроўні мець зносіны з замежнымі гасцямі, дапамагаць ім у выпадку неабходнасці. Мы працягваем нашу падрыхтоўку. Удасканаленню не можа быць мяжы. І толькі пасля таго, як чэмпіянат скончыцца, можна будзе казаць пра тое, наколькі мы былі да яго гатовыя і наколькі добра справіліся са сваімі задачамі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вераніка КАНЮТА.

■ Погляд

КРЫМСКІ РЭФЕРЭНДУМ: ПОСТСАВЕЦКАЯ ПЕРАДГІСТОРЫЯ

Рэферэндум у Крыме завяршыўся з вялізнай перавагай тых грамадзян, што прагаласавалі за ўступленне Крыма ў склад Расійскай Федэрацыі. Пераважная большасць заходніх СМІ і палітыкаў апісваюць сітуацыю з Крымам у адных і тых жа тэрмінах — грубая анексія, якая парушае міжнароднае права. Але ў цяперашніх падзей ёсць і свая перадгісторыя. І звязана яна галоўным чынам не з тым, што стагоддзямі Крым быў у складзе Расійскай імперыі і Савецкай Расіі, апынуўшыся практычна выпадкова ў складзе Украіны, а з тым, што адбывалася ў Расіі і вакол яе пасля краху Савецкага Саюза.

Нагадаем, што ў 1990-х гадах Расія прадэманстравала велізарнае жаданне супрацоўнічаць з Захадам. Усяляк акцэнтавалася, што ў яе няма больш глабальных амбіцый, рабіўся акцэнт на імкненні браць прыклад з заходніх эканамічных і палітычных інстытутаў. Прэзідэнт Ельцын публічна абмяркоўваў магчымасць уступлення Расіі ў склад Еўрасаюза і НАТА. Захаду дараваліся любыя яго крокі і грахі. Але як ён адрэагаваў на шчырае імкненне новай расійскай эліты да цеснай кааперацыі і супрацоўніцтва?

А адрэагаваў ён вельмі непрыстойна. Любы ахвотны можа пачытаць артыкулы вядучых палітыкаў і экспертаў у заходняй прэсе і навуковых часопісах таго часу. Ставіліся задачы не адбудоўваць мадэлі кааперацыі з дэмакратычнай Расіяй, а скарыстацца часовай слабасцю свайго самага небяспечнага саперніка за стагоддзі дамінавання Захаду, каб адабраць у Расіі ўсё, што магчыма. Расія, у адпаведнасці з гэтымі планамі, павінна была застацца без саюзнікаў, без моцнай эканомікі, без удзелу ў сур'ёзных інтэграцыйных структурах Захаду.

Краіны Усходняй і Цэнтральнай Еўропы і нават былыя рэспублікі СССР настойліва ўцягваліся ў НАТА і ЕС. Адбыўся дэфолт 1998 года. Абмяркоўваліся на Захадзе планы і па падзеле Расіі на мноства частак, але ім супрацьстаялі тыя, хто лічыў гэта небяспечным з-за вялізнага ядзернага арсеналу Масквы. Няхай лепш застаецца такой, як ёсць, пісалі яны, але вельмі слабай і пакорлівай волі Захаду.

Дарэчы, пацярпела ад гэтай палітыкі Захаду і Беларусь. Як толькі ўпершыню абраным Прэзідэнтам Рэспублікі быў абвешчаны курс не на еўраінтэграцыю, а на Саюзную дзяржаву з Расіяй, якая ў значна большай ступені адпавядала патрэбам эканомікі і памкненням грамадзян, адразу ж пачаліся ганенні, якія пазней выліліся ў санкцыі супраць суверэннай беларускай дзяржавы.

У пачатку XXI стагоддзя ў Маскве пачалі разумець, што спробы пасябраваць з Захадам асуджаны на правал. Але і заставацца другаразраднай краінай, у той аддаленай ад сусветнага спраў нішы, што калісьці магутнай Расіі адвялі заходнія «сябры», не хацелася. Пачынаюцца першыя спробы правядзення самастойнай палітыкі, на якія Захад рэагуе даволі негатыўна. На жаданне Расіі, каб ва Украіне знаходзіўся ва ўладзе схільны да супрацоўніцтва з ёй прэзідэнт, Захад рэагуе аранжавай рэвалюцыяй 2004 года.

На паўторны прыход Януковіча да ўлады ў 2010 годзе заходнімі краінамі арганізуюцца новыя геапалітычныя гульні з тым, каб паралізаваць любыя схемы супрацоўніцтва Украіны з Масквой. Калі ўкраінскае кіраўніцтва ўсё ж пераадольвае пастаўленыя перашкоды і вяртаецца да думкі аб неабходнасці цеснага супрацоўніцтва з Расіяй у лістападзе 2013 года, адбываецца чарговы Майдан і чарговая рэвалюцыя на карысць Захаду.

Палітыка Пуціна ў Крыме — гэта яго адказ на двайныя стандарты ў галіне міжнароднага права і сусветнай геапалітыкі, гэта спроба занадта сціснутай ад неабгрунтаванага заходняга ціску спружыны распрастацца. Чаму буйным заходнім краінам можна дзейнічаць без дазволу ААН і без якіх-небудзь далейшых санкцый з боку міжнароднай супольнасці, як гэта было ў выпадку ўварвання ЗША ў Ірак у 2003 годзе, а Расіі нельга? Чаму прызнанне Косава суверэннай дзяржавай прапагандуецца і навязваецца, а ў выпадку Крыма падобная палітыка аб'яўляецца абсалютна незаконнай? Чаму любая ўлада, якая выступіла з прарасійскімі ініцыятывамі ва Украіне, тут жа блакіруецца або звяргаецца пад сцягамі еўраінтэграцыі? Чаму фактычна абвешчана манаполія ЕС і ЗША на дамінаванне ў еўрапейскіх краінах, якія знаходзяцца ля межаў Расіі? Чаму еўраінтэграцыя аб'яўлена заходнімі краінамі натуральным шляхам для былых рэспублік СССР, а еўразійская інтэграцыя аб'яўляецца ненатуральнай? Чаму кожная спроба супрацоўнічаць з Захадам заканчваецца падманам з яго боку, як гэта адбылося ў 2011 годзе, калі згода Расіі на абмежаваны круг санкцый супраць Лівіі была выкарыстана для звяржэння лівійскага ўрада?

Палітыка Пуціна ў Крыме — гэта яго адказ на двайныя стандарты ў галіне міжнароднага права і сусветнай геапалітыкі, гэта спроба занадта сціснутай ад неабгрунтаванага заходняга ціску спружыны распрастацца.

У заходняй прэсе цяпер святкуюць перамогу тыя аналітыкі з Польшчы і краін Балтыі, якія два дзесяцігоддзі пісалі «пра расійскую пагрозу». Вось бачыце, кажуць яны, а мы ж вас папярэджвалі! Цікава, ці разумеюць яны самі, што ўсе папярэднія гады, нараўне з іншымі такімі ж аўтарамі, дапамагалі сфарміраваць неадэкватную сістэму бяспекі ў Еўропе, пры якой Расіі загадзя была падрыхтавана роля «пагрозы»? Што Расіі самім жа Захадам пакінуты вельмі абмежаваны набор сродкаў для адказу на тыя выклікі, якія ЗША і ЕС пастаянна ёй прад'яўляюць у сфарміраваным імі светапарадку? Што неразумна было трэціраваць і заганяць у кут самую буйную па тэрыторыі дзяржаву свету з вялізным ядзерным арсеналам?

У выніку ў Маскве пасля мноства раней дадзеных Захадам урокаў з'явілася дакладнае разуменне — гульня па заходніх прадпісаннях няўхільна прывядзе яе да поўнага паражэння. Застаецца толькі самой на хаду пісаць новыя правілы.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Спорт-тайм

«Спрынтарскае пракляцце» Домрачавай

Страчаны шанцы Домрачавай на Вялікі хрустальны глобус, першы трафей БАТЭ ў новым сезоне, нечаканы поспех беларускай велагоншчыцы Алены Амялюсік… У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязда» прыгадвае найбольш цікавыя навіны мінулага тыдня.

1. Трыумфатарам **перадапошняга этапу Кубка свету па біятлоне,** што праходзіў у фінскім Контыялахці, стала гаспадыня трасы Кайса Мякярайнэн. Фінка выйграла ўсе тры гонкі і амаль што гарантавала сабе перамогу ў агульным заліку па выніках сезона. Свае апошнія шанцы на заваяванне запаветнага трафея Дар'я Домрачава страціла, няўдала выступіўшы ў дзвюх спрынтарскіх гонках. У першай з іх трохразовая алімпійская чэмпіёнка дапусціла ажно чатыры промахі і на фініш прыкацілася толькі з 37-м часам. У другім спрынце чыста адстраляцца таксама не атрымалася: тры асечкі — і 20-я пазіцыя. Затое ў нядзельным пасьюце Дар'я адзіная с шасцідзесяці біятланістак прамахнулася толькі аднойчы (і гэта пры моцным ветры!) і, адыграўшы 18 пазіцый, узышла на другую прыступку п'едэстала. Гэты подыум стаў дзясятым у сезоне 2013/2014 для Домрачавай.

Перад апошнім этапам у нарвежскім Халменколене Дар'я займае трэці радок у агульным заліку, надзея Скардзіна — 12-я. Тым не менш лідар нашай зборнай яшчэ можа пазмагацца за Малы хрустальны глобус у масстартах. У гэтым заліку Домрачава на 14 ачкоў апярэджвае Кайсу Мякярайнэн і Туру Бергер.

2. Барысаўскі БАТЭ перамогай стартаваў у новым сезоне. У матчы за **Суперкубак Беларусі** жоўта-сіняя **абыгралі леташніх уладальнікаў трафея** — ФК «Мінск». Вырашальны гол у першым тайме са штрафнога забіў сербскі навабранец барысаўчан Філіп Младзенавіч. Пасля матча трыумфатар прызнаўся, што ўпершыню забіў гол са штрафнога: «Гэта ўвогуле мой трэці гол у кар'еры. Дзякуй трэнерам, што даверылі мне правесці гэты ўдар. На Радзіме ў складзе «Црвенай Звезды» я ўжо заваёўваў Кубак Сербіі, Суперкубак Беларусі — мой другі трафей. Беларуская кар'ера пачынаецца для мяне проста выдатна». Нагадаем, што БАТЭ трэці раз стаў уладальнікам Суперкубка Беларусі.

3. Беларуская велагоншчыца Алена Амялюсік стала другой у шматдзённы «Вуэльта Сальвадор». Беларуская спартсменка саступіла 2 хвіліны 18 секундаў амерыканскай гоншчыцы Мары Эбат. Тым не менш Амялюсік першынствавала ў горным і спрынтарскім заліках. Акрамя гэтага, разам з партнёршамі па «Астана Бі Пінк» беларуска стала лепшай у камандным заліку.

4. Саступіўшы ў хатнім матчы падмаскоўнаму «Трыумфу», каманда **«Цмокі-Мінск» страціла шанцы на выхад у плэй-оф Адзінай лігі ВТБ.** Такім чынам, «Цмокі» скончылі выступленне ў турніры на апошнім, дзясятым, радку ў групе В.

5. У Стамбуле прайшло **лёсаванне чэмпіянату свету па баскетболе сярод жанчын.** Зборная Беларусі трапіла ў групу С, дзе кампанію нашым дзяўчатам склалі аўстралійкі, кубінкі і паўднёвакарэйскія спартсменкі. Здаецца, неблагі варыянт. Мяркуем, што барацьбу за лідарства ў групе беларускія баскетбалісткі павядуць з відавочнымі фаварыткамі — аўстралійкамі. А як яно адбудзецца, пабачым праз паўгода.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

■ Скарбніца майстроў

ВАЛОШКА НА ТКАНІНЕ, МЕТАЛЕ, ПАПЕРЫ

Музей — якраз тое месца, дзе на свае вочы можна пераканацца ў хуткаплыннасці часу і бессмяротнасці мастацтва. Ідуць стагоддзі, але іх вобразы, занатаваныя майстрамі, застаюцца ў музейных залах. У адной з такіх залаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь гэтымі днямі можна было назіраць, як жыве-працягваецца сувязь паміж стагоддзямі дзякуючы пераемнасці майстроў.

Побач са старасвецкімі прадстаўнікамі роду Радзівілаў (яны пазіралі з вялікіх партрэтаў) пад старажытныя мелодыі ў выкананні фальклорнага ансамбля «Тутэйшая шляхта» кожны наведвальнік музея змог на імгненне дакрануцца да сусветна вядомага слуцкага пояса. Нікому не верылася, што на самой справе гэтая прыгажосць створана ў наш час. Такі цуд здзейснілі сучасныя беларускія майстры, якія адрадзілі тэхналогіі радзівілаўскай мануфактуры.

Музейны паказ першых узораў слуцкіх паясоў XXI стагоддзя адбыўся адначасова з прэзентацыяй памятных манет серыі «Слуцкія паясы», якую выпусціў Нацыянальны банк. Сярэбраныя і медна-нікелевыя манеты багата аздоблены паэтычнымі карункамі на тэму сусветна вядомага слуцкага брэнда. Сучасны мастак, натхнёны творчасцю майстроў старажытнай «персіярні», перадаў на метале тонкі арнамент з палявых кветак. Такія манеты можна будзе купіць у аддзяленнях Нацыянальнага банка. Набываюць іх для продажу і камерцыйныя банкі.

Тыя, хто два з паловай стагоддзі таму ткаў залатымі ніткамі «...цвяток радзімы васілька», безумоўна, не ўяўлялі, што іх узоры разляцяцца некалі па ўсім свеце. Сёння адпраўленае з Беларусі пісьмо прынясе на любы кантынент арыгінальную трохвугольную марку з выявай часцінкі

слуцкага пояса. Прэзентацыя такой маркі і канверта «Слуцкія паясы», выпушчаных Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі, стала яшчэ адной часткай незвычайнага музейнага свята.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

На здымках:

1. Намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Тозік, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Надзея Ермакова, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў у час цырымоніі пагашэння маркі і канверта.

2. Новыя памятныя манеты.

3. Адроджаная прыгажосць паясоў — справа сучасных беларускіх майстроў

■ Нетыповы выпадак

АБМЕЖАВАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ СУПРАЦЬ НЕАБМЕЖАВАНАГА ЦЫНІЗМУ?

Як інвалід-калясачнік выйграў суд у забудоўшчыка свайго дома і што з гэтага выйшла

Рычарду Паўлоўскаму 55 гадоў, больш за 20 з якіх ён правёў у інваліднай калясцы. Некалькі гадоў таму спадар Паўлоўскі ўступіў у таварыства ўласнікаў і заключыў дагавор на долевае будаўніцтва жылля. На новую жылплошчу давялося выдаткоўваць каля 70 тысяч долараў, пры тым, што на атрыманне крэдыту інвалід першай групы разлічваць не мог. Але мара пра жыццё ў новых апартаментах не здзейснілася: па завяршэнні будаўніцтва выявілася, што дом не адпавядае патрабаванням безбар'ернага асяроддзя і гэта робіць немагчымым свабоднае пражыванне ў ім інваліда-калясачніка. Вусныя перамовы з фірмай-забудоўшчыкам ні да чаго не прывялі, і мужчына звярнуўся ў суд.

Пастанова суда — толькі на паперы

— Першапачаткова забудоўшчык парушыў будаўнічыя нормы, якія распаўсюджваюцца не толькі на людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, яны абавязковыя для ўсіх, — кажа Рычард Паўлоўскі.

Прэтэнзіі мужчыны датычыліся вышыні парогаў у пад'ездзе, якія замест нарматыўных 2,5 см дасягалі 6-7 см, а таксама вузкіх дзвярных праёмаў, у якія не праходзіла інвалідная каляска.

— Для каляскі такая вышыня парогаў неадольная, бо дыяметр кола — 10-12 см. Яна можа проста перавярнуцца, — тлумачыць спадар Паўлоўскі.

У выніку працэс мужчына выйграў: суд абавязаў забудоўшчыка (ім выступіла кампанія «Белінтэ-Роба», вядомая такімі праектамі, як жылыя комплексы «Вівальдзі», «Бетховен», «Маяк Мінска» і іншыя) цягам трох гадоў выправіць парушэнні, а таксама спагнаў з яго на карысць істца 4 млн 800 тысяч рублёў (сюды ўвайшлі два мільёны маральнай шкоды, нанесенай Паўлоўскаму, а таксама паслугі адваката і судовага прыстава).

Тое, што інвалід-калясачнік стаў на абарону сваіх правоў, — з'ява сама па сабе рэдкая. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі і на вуліцу выязджаюць не часта, а тут чалавек звярнуўся ў суд і выйграў яго! Але, нягледзячы на гэта, выканаць судовую пастанову адказчык не спяшаецца, хоць мінула ўжо больш за палову адведзенага на гэта тэрміну.

— Ідзе проста адцягванне часу, — упэўнены Рычард Паўлоўскі. — Бо спачатку для выпраўлення хібаў трэба заказаць праект, які павінен прайсці экспертызу. Але да апошняга даследавання судовым выканаўцам дома яшчэ нічога не было зроблена.

Чаму справа не кранаецца з мёртвай кропкі, «Звязда» вырашыла пацікавіцца ў самога адказчыка.

— Суд вынес незаконнае рашэнне, бо адказчыкамі па справе павінны быць таварыства ўласнікаў і генпадрадчык — кампанія «МАПІД», на якую мы ўжо падалі іск у суд. Бо гэтая кампанія будавала дом, яна — вытворца, а мы — прадавец, — сказаў **начальнік юрыдычнага аддзела СТАА «Белінтэ-Роба» Антон ЛІХУТА.**

Таксама прадстаўнік забудоўшчыка дадаў, што яны зрабілі пандусы з керамічнай плітачкі на паверсе істца, але той застаўся незадаволеным. Зрэшты, забудоўшчык прызнаў, што нормы парушаны. Але як так атрымалася, што ён прадае жыллё з парушэннямі нарматываў, — загадка.

Па словах Рычарда Паўлоўскага, адказнасць нясе менавіта забудоўшчык, таму што ён уносіў змены ў праект.

— Калі ёсць закон, трэба выконваць яго. Я не хачу залежаць ад нейчага жадання, — кажа Рычард.

А залежаць у гэтай сітуацыі Рычарду Паўлоўскаму даводзіцца і ад забудоўшчыка, і ад таварыства ўласнікаў, і нават ад адміністрацыі раёна. Трапіць да мясцовай улады мужчына не можа, бо, зноў-такі, будынак, дзе знаходзіцца адміністрацыя, не прыстасаваны да безбар'ернасці. У выязным прыёме інваліду адмовілі і прапанавалі правесці прыём па тэлефоне, ды і тое толькі праз месяц. Адметна, што падчас судовых пасяджэнняў прадстаўніца адміністрацыі раёна лічыла іск беспадстаўным, нягледзячы на абавязковае выкананне «Дзяржаўнай праграмы па стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011 — 2015 гады».

Калі ў таварыстве — не таварышы

Пытанні спадар Паўлоўскі мае і да таварыства ўласнікаў. Яго, як і патрабаваў закон, стварыў забудоўшчык. Цікава, што старшынёй прызначылі супрацоўніцу кампаніі-забудоўшчыка, якая, праўда, пасля звольнілася, але жыхары ўпэўнены, што яна дзейнічае не толькі на іх карысць. Праз паўгода пасля здачы дома планавалася правесці агульны сход, на якім трэба было абраць форму кіравання, рэвізійную камісію і старшыню. Аднак, як сцвярджае Рычард Паўлоўскі, цягам трох гадоў ніякіх сходаў не праводзілася, а тэрмін паўнамоцтваў старшыні даўно мінуў.

Тым часам жыльцы новага дома заўважылі, што атрымліваюць падазрона вялікія рахункі за ацяпленне. Справа ў тым, што цэны на жыллёва-камунальныя паслугі для кватэр, у якіх ніхто не зарэгістраваны, выстаўляюцца па эканамічна абгрунтаваных затратах. Як сведчыць тэкст заявы, накіраванай жыльцамі ў Дэпартамент фінансавых расследаванняў, пастаўшчыкам паслуг даныя па колькасці непрапісаных не прадастаўлялі-ся, таму РУП «Мінскэнерга» і УП «Мінсккамунцепласетка» выстаўлялі таварыству ўласнікаў рахункі зусім па іншых, ільготных тарыфах. Куды ж падзелася розніца — невядома. У сувязі з гэтым Рычард Паўлоўскі звярнуўся на «гарачую» тэлефонную лінію адміністрацыі Цэнтральнага раёна. Неўзабаве прыйшоў адказ за подпісам намесніка кіраўніка адміністрацыі, што, па інфармацыі таварыства ўласнікаў(!), цеплавы складнік на ацяпленне і падагрэў вады прымаўся да ўліку ў адпаведнасці з нарматывам, зацверджаным Мінгарвыканкамам. Тым не менш пасля перараразліку грошы жыхарам дома вярнулі. Пытанне: калі плату здымалі згодна з нарматывам, што тады вярнулі? Але сітуацыя набыла яшчэ больш цікавы характар. Пры тым, што ўсе жыльцы спраўна (і, як выявілася, нават у большым памеры, чым патрабавалася) аплачвалі камунальныя паслугі, перад іх пастаўшчыкамі ў жыхароў дома набегла немалая запазычанасць. Атрымаўся нейкі цудоўны кругаварот фінансаў у адным таварыстве...

Пра бардзюры і любоў да Радзімы

Сутыкнуўшыся з паўсюднай абыякавасцю, спадар Рычард амаль згубіў надзею на вырашэнне сваёй праблемы.

— Чыноўнікі гавораць пра безбар'ернае асяроддзе, грошы на яго выдзяляюцца, а толку няма. Аднойчы размаўляў з прадстаўніком адміністрацыі раёна пра безбар'ернае асяроддзе. У выніку мне сказалі, што я не люблю сваю Радзіму, бо ўсім незадаволены... Я люблю Радзіму, але не разумею, чаму гэтая любоў павінна быць абмежаванай высокімі бардзюрамі? Радзіма не заканчваецца дзвярыма ўласнай кватэры, але часта далей за іх я трапіць не магу...

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Дзённік настаўніка

ДЗЕЦІ І ІНТЭРНЭТ

Два адкрыцці, якія літаральна перавярнулі сучасны свет: інтэрнэт і мабільная сувязь.

Але пра мабільную сувязь як-небудзь іншым разам. А зараз хачу крыху паразважаць пра «сусветную павуціну». Дакладней, пра ўзаемаадносіны нашых дзяцей з ёю...

Калі зусім нядаўна (гадоў дваццаць таму) нават самы звычайны, самы просценькі камп'ютар разглядаўся ў нашай краіне як нейкая экзотыка, то зараз ён амаль што ў кожнай сям'і ёсць. І не просценькі, а з рознымі, так бы мовіць, «наваротамі». А часта і не адзін на сям'ю. У мужа свой, у жонкі свой... у дзяцей таксама асобны, каб дарослым не перашкаджалі. І, зразумела ж, амаль усе камп'ютары маюць выхад у інтэрнэт...

І нашы дзеці праводзяць перад маніторам даволі шмат часу...

А многія — дык вельмі шмат... І ўжо не могуць без інтэрнэту нават і дня пражыць... З'ява гэтая называецца «інтэрнэт-залежнасць». І яна з кожным годам усё «маладзейшай» робіцца, бо выяўляюць яе цяпер нават у дзяцей дашкольнага ўзросту. У ЗША дык і ўвогуле адкрываюцца спецыяльныя клінікі і пункты рэабілітацыі, дзе такія «хворыя» (а сярод іх і шмат падлеткаў) праходзяць курс лячэння...

Здаецца, выйсце тут адно толькі: поўнасцю забараніць дзецям бавіць час у інтэрнэце, зрабіць так, каб яны і блізка да камп'ютара не змаглі падысці!

Але хіба ж гэта выйсце?

Жадаем мы таго ці не, але будучыня менавіта за камп'ютарнымі тэхналогіямі. І адстаць тут — значыць прайграць, заведама адводзячы сабе другарадныя ролі ў прамысловай вытворчасці, у навуковых распрацоўках.

У пытаннях абароны, нарэшце!

А ў выйгрышы ў будучым акажуцца менавіта тыя краіны, чые сённяшнія школьнікі больш поўна авалодаюць сучаснымі камп'ютарнымі і інтэрнэт-тэхналогіямі.

Таму нічога кепскага няма ў тым, што сучасныя дзеці цікавяцца камп'ютарам і інтэрнэтам. Іншая справа, што менавіта іх там больш за ўсё цікавіць.

Калі падлетак самастойна спрабуе распрацоўваць камп'ютарныя праграмы, ствараць уласныя сайты ці блогі — усё гэта, на мой погляд, можна толькі вітаць! Але ж часцей за ўсё сучасныя дзеці гадзінамі «гойсаюць» па «адназласніках» і іншых сайтах знаёмстваў ці начамі праседжваюць за анлайн-гульнямі. А раніцай ідуць у школу... Ды што ім тая школа і тая вучоба! Сядзяць сонныя і мараць аб адным толькі: прыбегчы дадому і хуценька «компік» уключыць. А некаторыя бацькі яшчэ і радуюцца: якое дзіця паслухмянае! Па вуліцы не бадзяецца, дома кожны вечар. Так што не трэба за яго хвалявацца...

Трэба! І яшчэ як трэба!

Я ўжо не кажу пра тое, як гэтае нерухомае шматгадзіннае знаходжанне перад маніторам уплывае на паставу вучня, яго зрок, агульнае фізічнае развіццё. На яго псіхіку, у рэшце рэшт!

Я гэта аб інтэрнэт-залежнасці, якая, па меркаваннях многіх вучоных, не менш небяспечная, чым залежнасць наркатычная...

Вось некаторыя з прыкмет інтэрнэт-залежнасці, якія павінны хоць неяк насцярожыць бацькоў:

1) Калі працягласць знаходжання дзіцяці ў інтэрнэце з кожным днём узрастае, а вашы спробы хоць нейкім чынам абмежаваць гэтае знаходжанне выклікаюць бурную, а часам і неадэкватную рэакцыю.

2) Калі ў вашага сына альбо дачкі пачаліся раптам рэзкія і нечаканыя перапады настрою, значна знізілася паспяховасць у вучобе, ды і наогул знікае цікавасць да таго, што адбываецца навокал, акрамя вядома ж, «сусветнай павуціны», у якую яны, як тыя мухі, патрапілі...

Тут ужо варта біць трывогу. І зрабіць усё, каб вызваліць падлетка ад гэтай інтэрнэт-залежнасці, вярнуць яго да нармальнага паўнацэннага жыцця.

Але ўсё трэба рабіць узважана і асцярожна. Прынцып «Не нашкодзь!» тут актуальны як ніколі. Бо колькі было выпадкаў, калі дзеці пасля поўнай забароны бацькамі інтэрнэту, збягалі з дому...

І ўсё ж праблему трэба неяк вырашаць... А лепш не даводзіць да таго, каб яна ўзнікла, гэтая праблема. Не забараняць, а захвочваць! Спортам, турызмам, літаратурай, жывапісам, музыкай... Калекцыяніраваннем, у рэшце рэшт!

Але толькі разам — вы і дзеці! Зрабіце так, каб з вамі, у рэальным жыцці, ім было значна больш цікавей, чым на нейкіх там «сайтах знаёмстваў»...

Генадзь АЎЛАСЕНКА

■ Соцыум

ПЕРШЫ Ў РАЁНЕ

У Бешанковіцкім раёне адкрыўся першы дзіцячы дом сямейнага тыпу. Ён — 22-гі па ліку ва ўсёй Віцебскай вобласці.

Цяпер у аграгарадку Ула ў вялікім і ўтульным доме выхоўваюцца пяць дзяцей ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў. І толькі адзін з іх для мужа і жонкі родны. Ірына Валянцінаўна Адамовіч нават можа пакрыўдзіцца, калі яе дзяцей дзеляць на «сваіх» і «чужых». Цікава, што быў час, калі яна працавала выхавальніцай у дзіцячым садку, абіралася дэпутатам райсавета. За паспяховае выхаванне родных і прыёмных дзяцей Ірына Валянцінаўна была ўзнагароджана Віцебскім аблвыканкамам прэміяй імя Героя Савецкага Саюза Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі.

— Наша сям'я заснавана на любові, павазе. Мае родныя дзеці, іх чацвёра, акрамя аднаго — дарослыя... У 2003 годзе ў нашай сям'і з'явілася першае прыёмнае дзіця — Вольга, якой на той час было дзесяць гадоў. Пасля заканчэння школы яна паступіла ў каледж, а сёння працуе ў сельскагаспадарчым закрытым акцыянерным таварыстве, — расказвае яна.

У жніўні 2008 года Ірына Валянцінаўна ўзяла на выхаванне Дзмітрыя, у траўні 2012 года — Карыну, а ў чэрвені мінулага — сясцёр Анжэліку і Уладу. Разам з імі выхоўваецца родны сын Антон, якому 9 гадоў. Разам усе разам жылі ў сваім доме без выгод, а цяпер пераб раліся ў «палац».

Узводзіць вялікі катэдж пачалі летась. На яго будаўніцтва выдаткавана 719 мільёнаў рублёў з рэспубліканскага бюджэту і 660 мільёнаў рублёў — з абласнога. Раённы выканаўчы камітэт выдзеліў 150 мільёнаў рублёў на мэблю і ўсё неабходнае для пражывання дзяцей. І спонсары дапамаглі — каля 25 мільёнаў рублёў выдаткавалі.

Паводле слоў **Леаніда ПЯНЬКОЎСКАГА, старшыні Бешанковіцкага райвыканкама,** усяго ў раёне каля 30 апякунскіх і прыёмных сем'яў, у якіх выхоўваюцца больш як 40 дзяцей.

— Мы ўпэўнены, што сям'я Адамовічаў дасць прыёмным дзецям цеплыню, ласку, здолее выхаваць з іх добрых людзей і дастойных грамадзян сваёй краіны, — сказаў кіраўнік раёна.

— Адкрыццё першага дома сямейнага тыпу — унікальная падзея для раёна. Такія дамы — самы эфектыўны спосаб стварыць умовы, набліжаныя да звычайнай сям'і, — падкрэсліў **Леанід СЦЯПАНАЎ, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама.**

Зусім хутка аналагічны дом сямейнага тыпу адкрыецца ў Талачынскім раёне. У планах — адкрыццё такіх жа ў Шаркоўшчынскім і Расонскім раёнах...

Як паведамілі «Звяздзе» ў Бешанковіцкім райвыканкаме, па інфармацыі на 1 сакавіка, у раёне 75 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. З іх толькі 34 знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Летась 5 дзяцей былі перададзены на выхаванне ў прыёмныя сем'і, 1 — у апякунскую сям'ю.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ На кантролі

КАРУПЦЫЯ — ЯК ІРЖА

На нядаўняй нарадзе Прэзідэнт разбуральную сілу карупцыі параўнаў з іржой. Апошняя, калі ад яе не пазбавіцца, раз'есць усё. Таму кіраўнік краіны заклікаў чыноўнікаў зрабіць высновы з падзей у суседняй Украіне (адна з прычын развалу краіны — карупцыя) і, калі не хочуць апынуцца за кратамі, працягваць сумленна працаваць.

Летась на працоўным месцы затрымалі намесніка мэра Мінска Ігара Васільева. Чыноўнік вымагаў у інвестара каласальны па беларускіх маштабах хабар у паўмільёна долараў. Па рашэнні суда бліжэйшыя 14 гадоў свайго жыцця хабарнік правядзе ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Следам за ім за краты адправіўся былы мэр Гомеля, які незаконна размяркоўваў кватэры паміж сваякамі і знаёмымі.

На хабары папаўся і намеснік старшыні суда Кастрычніцкага раёна Магілёва. Ён узяў у адваката 2700 долараў, каб паменшыць тэрмін яго падабароннаму.

А зусім нядаўна Генпракуратура абвінаваціла экс-дырэктара Мінскіх электрасетак у будаўніцтве катэджа за казённы кошт. «Ён незаконна выкарыстаў працу падначаленых работнікаў і аўтатранспарт прадпрыемства пры будаўніцтве жылога дома, — удакладніў начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры Ігар Грэйба. — Пры гэтым складаў фальшывыя дакументы».

Як бачыце, ні з адным карупцыянерам, якога б ён ні меў рангу ці звання, беларускія праваахоўнікі не цырымоняцца і не будуць, каб не разводзіць іржу...

Надзея ПАЎЛАВА

■ Ініцыятыва

«ПРОДАЖ» ВАКАНСІЙ БЕСПРАЦОЎНЫМ АКАЖАЦЦА ПА-ЗА ЗАКОНАМ

Мінгандаль Беларусі вырашыў распрацаваць правілы аказання паслуг па працаўладкаванні, паведаміла ўчора на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Ірына Барышнікава.

Пры гэтым прадстаўнік міністэрства адзначыла, што прадастаўленне беспрацоўным даведачна-інфармацыйных паслуг, за падключэнне да якіх бяруцца велізарныя грошы, з'яўляецца адмоўнай практыкай, якая ў нашым грамадстве лічыцца проста неэтычнай. Папярэдне ў міністэрстве была вывучана сусветная практыка па аказанні паслуг беспрацоўным, паводле якой «нідзе не бяруць грошай з суіскальнікаў». Падобныя метады дапамогі за грошы неабходна выкрасліць, упэўнена спецыяліст.

Начальнік упраўлення ўдакладніла пазіцыю міністэрства наконт правоў спажыўцоў. У нашай краіне адсутнічае такая з'ява, як спажывецкі экстрэмізм, затое з'явіліся спажыўцы, добра дасведчаныя аб сваіх правах, адзначыла Ірына Барышнікава. Сёння яны больш актыўна адстойваюць свае законныя правы. І нічога дрэннага ў такой актыўнай пазіцыі няма. Начальнік упраўлення лічыць, што ўсім без выключэння суб'ектам гаспадарання варта прывыкнуць да таго, што ў Беларусі ёсць заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў і яго неабходна выконваць. Менавіта ад таго, наколькі спажывец ведае свае правы, умее і не баіцца іх адстойваць у любым сегменце спажывецкага рынку, залежыць вельмі многае. У выніку гэта ўплывае на паляпшэнне сацыяльна-эканамічнага дабрабыту насельніцтва і краіны ў цэлым.

У гэтым кірунку кіраўніцтва галіны таксама не спіць у шапку. У свой час, паводле прапановы Мінгандалю, былі павялічаны штрафы за рэалізацыю таварaў са скончаным тэрмінам прыдатнасці, захоўвання і рэалізацыі (мінімальны штраф быў павялічаны са 100 да 420 долараў, а максімальны — з 600 да 7 тысяч долараў у эквіваленце).

Сяргей КУРКАЧ

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ на II кв. або 1-е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс)

_____

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **ДА 9 КРАСАВІКА** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

СУПЕРПРЫЗ тэлевізар SAMSUNG

7 электрапрасаў BOSH

Сярод падпісчыкаў 11.04.2014 г. будуць разыграны 7 электрапрасаў Bosh і суперпрыз – тэлевізар Samsung. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» да 21.04.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2014 года і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 19.02.14 г.

ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 20.02.14 ПА 30.06.14.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2302 ад 13.02.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

«КАБ ВЯРТАЛІСЯ ПТУШКІ ДАМОЎ...»

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці пад такой назвай працуе ў выставачнай зале «Берагіня» ў БНТУ. Лялькі, аплікацыі і пано, павукі, посуд, сумкі, пацеркі... «З залатой саломкі можна зрабіць амаль усё!» — упэўнены маленькія майстры. Больш за сто прыгожых работ, што прадстаўлены на выставе, зроблены вучнямі мінскай сярэдняй школы № 3. Гурткі «Добры настрой», «Чароўная саломінка», «Ажурныя ўзоры» наведваюць як вучні пачатковых класаў, так і выпускнікі. На ўрачыстым адкрыцці ўсе наведвальнікі дачакаліся «птушак» з выраю, падчас майстар-класа паспрабавалі свае сілы ў тэхніцы саломапляцення, а таксама паўдзельнічалі ў беларускім абрадзе гукання вясны. Выстава будзе працаваць да 21 сакавіка.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Індэкс/перыяд		1 месяц	3 месяцы
63850	(для індывідуальных падпісчыкаў)	47 500	142 500
63145	(для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў)	42 750	128 250
63858	(для ведамасных падпісчыкаў)	95 300	285 900
63239	(ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя)	85 800	257 400

Гісторыя паўтараецца?

Мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў: «за» і «супраць»

На нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы падчас абмеркавання прыёмнай кампаніі прагучала прапанова павялічыць мэтавы набор абітурыентаў на шэраг дэфіцытных для рынку працы спецыяльнасцяў. Калі гэтая прапанова будзе ўхвалена, то мэтавы набор у ВНУ на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці можа павялічыцца да 60% ад кантрольных лічбаў прыёму, а па іншых спецыяльнасцях — да 40%. У сярэдніх спецыяльных навучальных установах на сельскагаспадарчых і медыцынскіх спецыяльнасцях мэтавы набор вырасце да 60% ад кантрольных лічбаў прыёму і да 30% — на іншых. Мяркуецца, што такім чынам дзяржаве ўдасца, нарэшце, забяспечыць кадрамі школы і дзіцячыя садкі, бальніцы і паліклінікі. Аднак ці спраўдзяцца гэтыя спадзяванні?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Апошні раз палажэнне аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў пераглядалася пяць гадоў таму. У 2009 годзе мэтавы набор на спецыяльнасці сельскагаспадарчага, лесагаспадарчага, медыцынскага, педагагічнага профіляў, а таксама на спецыяльнасці чыгуначнага транспарту, журналістыкі, культуры і мастацтва, было дазволена павялічыць да 30 працэнтаў ад кантрольных лічбаў. Пашырыўся і пералік асоб, якія маглі прэтэндаваць на навучанне на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі... Але ці стала ў медыцынскіх установах больш урачоў, а ў дзіцячых садках — больш выхавальнікаў?

Праз пяць гадоў гісторыя паўтараецца: лічбы мэтавага набору зноў павялічваюцца, а кола прэтэндэнтаў на мэтавую падрыхтоўку пашыраецца. Цяпер заключаць дагавор з заказчыкамі кадраў змогуць, як мяркуецца, і жыхары буйных гарадоў.

Але прывядзём некалькі лічбаў: летась у Беларускім дзяржаўным медыцынскім каледжы на 270 бюджэтных месцаў па спецыяльнасці «Сястрынская справа» было залічана толькі 205 ахвотных. Прыём ажыццяўляўся па выніках тэсціравання па біялогіі і дзяржаўнай мове. Узялі ўсіх, нягледзячы на балы.

У Мінскім медыцынскім каледжы з 240 бюджэтных месцаў «Сястрынскай справы» занятыя былі толькі 176. На педагагічных спецыяльнасцях у ВНУ засталіся незапоўненыя 296 бюджэтных месцаў, з іх 184 — фізіка-матэматычнага профілю...

Кадравую праблему можна і трэба вырашаць толькі ў комплексе з павышэннем сацыяльнага статусу педагога.

Няўжо калі мэтавы набор у медыцынскія каледжы павялічаць да 60%, то моладзь рынецца масава падпісваць кантракты з наймальнікам, якія накладваюць вельмі сур'ёзныя абавязкі на выпускніка?

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры сямейнай і моладзевай палітыцы, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў Дзмітрый ШАЎЦОЎ упэўнены, што мэтавая падрыхтоўка выгадная адначасова для двух бакоў: дзяржава з яе дапамогай вырашае кадравыя праблемы, а абітурыенты, у сваю чаргу, атрымліваюць сур'ёзныя прэферэнцыі на ўваходзе ў ВНУ.

Калі абітурыенту не хапае балаў у сертыфікатах ЦТ, калі ў яго не вельмі «моцны» дакумент аб адукацыі і ў сям'і няма сродкаў, каб аплачваць навучанне свайго дзіцяці, то мэтавая падрыхтоўка — гэта цудоўны шанц для маладога чалавека стаць студэнтам і атрымліваць стыпендыяльнае забеспячэнне. Але пры гэтым трэба быць гатовым да таго, што даўгі дзяржаве ўсё роўна давядзецца вяртаць.

Але павелічэнне мэтавага набору — толькі адна з мер, скіраваных на забеспячэнне кадрамі ўстаноў аховы здароўя. Безумоўна, пяць гадоў, якія выпускнік павінен потым адпрацаваць на наймальніка, — тэрмін немалы, каб спецыяліст паспеў замацавацца на першым працоўным месцы. Аднак, як сведчыць практыка, утрымаць кадры немагчыма, калі ў іх не зацікаўлены мясцовыя ўлады, калі моладзь не адчувае з іх боку падтрымку, калі ў маладых спецыялістах папросту не зацікаўлены. Некаторым кіраўнікам прасцей зрабіць новы запыт на размеркаванне чарговага маладога спецыяліста, чым утрымаць яго папярэдніка. Дзмітрый Шаўцоў прывёў канкрэтны прыклад. Падчас яго працы ў Жлобінскім ТМА ў агульнаўрачэбную амбулаторыю была размеркавана выпускніца медуніверсітэта, вельмі перспектыўны спецыяліст:

— Дзяўчына адразу заявіла, што не плануе надоўга затрымлівацца ў раёне: маўляў, у яе іншыя прафесійныя планы. Аднак маладому ўрачу быў выдзелены домік, яна выйшла замуж, яе жыццёвыя і прафесійныя планы змяніліся: наколькі я ведаю, яна і сёння працуе ў амбулаторыі і ўсім задаволена...

На думку дэпутата, стаўку ў навучанні трэба рабіць менавіта на «мэтавікоў», паколькі ў медыцынскія ўстановы адукацыі павінны прыходзіць чулыя і бескарыслівыя маладыя людзі, якія свядома падышлі да выбару будучай прафесіі, якія гатовы да ўсіх нюансаў нялёгкай работы ўрача або медыцынскай сястры. А што мы назіраем у апошнія гады? Медыцынскія ВНУ выпускаюць урачоў, якія праз некалькі гадоў работы сыходзяць у фармацэўтычныя фірмы, касметалогію і гэтак далей. З іншага боку, спрашчаючы паступленне ў навучальную ўстанову, галоўнае — не перастарацца, каб не пацярпела якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. А ўстановам адукацыі, у сваю чаргу, неабходна звярнуць увагу на прафарыентацыю моладзі і больш актыўна агітаваць за прафесію медыцынскага работніка.

— Трэба разабрацца, што мы імкнёмся вырашыць, павялічваючы мэтавы набор і тэрміны адпрацоўкі па размеркаванні. Бягучыя кадравыя праблемы мы, магчыма, і закрыем, але ці вырашым пытанне на перспектыву? — дзеліцца сваім меркаваннем **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Дапускаю, што знойдуцца маладыя людзі, якія прымуць прапанаваныя ўмовы гульні і падпішуць кантракты на мэтавую падрыхтоўку. Адпрацуюць пяць гадоў. Але што будзе далей, калі сітуацыя ў адукацыі не зменіцца? Ні для каго не сакрэт, што на педагагічных спецыяльнасцях у ВНУ ўжо не першы год недаборы. А многія з залічаных на першы курс не ў стане асіліць нават першую экзаменацыйную сесію. Дык, можа, надышоў час звярнуць больш пільную ўвагу на патрэбы работнікаў адукацыі і павышэнне прэстыжу працы педагога? Кадравую праблему можна і трэба вырашаць толькі ў комплексе з павышэннем сацыяльнага статусу педагога.

БУДЗЬ У КУРСЕ:

Паводле дзеючага парадку, падставай для скасавання дагавора на мэтавую падрыхтоўку могуць быць толькі медыцынскія паказанні, ліквідацыя арганізацыі, у якой працуе «мэтавік», або пераразмеркаванне, якое адбываецца ў інтарэсах дзяржавы і па ўзгодненні з дзяржаўным органам, зацікаўленым у мэтавай падрыхтоўцы спецыяліста. Змяненне сямейнага становішча ўважлівай прычынай не лічыцца.

Ёсць і яшчэ адна пагроза: усе мы ведаем, што ў настаўнікі пакуль не ідуць лепшыя вучні. А ў педагогіку, на жаль, усё часцей трапляюць выпадковыя людзі. Ужо колькі гадоў абмяркоўваецца ўвядзенне прафадбору для навучання на педагагічных спецыяльнасцях, паколькі педагогіка — прафесія не для кожнага. У ёй важна ўсё: і ўменне працаваць у калектыве, і ўменне ставіць вучня вышэй за сябе, і жаданне ўвесь час развівацца, наяўнасць пэўных псіхалагічных якасцяў, псіхалагічная ўстойлівасць. Прапаноўвалася таксама ўвесці нешта накшталт інтэрнатуры, як для выпускнікоў медыцынскіх ВНУ, — такі своеасаблівы допуск да прафесіі... А цяпер уявіце сабе, што выпадковы чалавек прыходзіць у школу. Прычым на пяць гадоў. Тут ёсць над чым падумаць... У любым выпадку прыняцце рашэння аб заключэнні дагавора на мэтавую падрыхтоўку павінна быць добра прадуманым і ўзважаным, каб не было затым у жыцці расчаравання, каб маладыя людзі не імкнуліся збегчы з сістэмы адукацыі пры першай жа магчымасці...

Разам з тым, у галоўным адукацыйным ведамстве не ўтойваюць, што падчас уступнай кампаніі сустракаюцца выпадкі, калі абітурыенты, набраўшы на цэнтралізаваным тэсціраванні высокія балы, не карыстаюцца сваім мэтавым накіраваннем і паступаюць па агульным конкурсе. Усё ж такі адпрацаваць два гады па размеркаванні прасцей, чым пяць гадоў. Забараніць ім гэта не могуць. Ва ўсялякім выпадку, не маглі... Таму і ўзнікла ідэя прапаноўваць кантракт на мэтавую падрыхтоўку абітурыентам ужо пасля таго, як пройдзены ўсе ўступныя выпрабаванні. Магчыма, што для кагосьці гэта і сапраўды будзе выдатнай магчымасцю стаць студэнтам?

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Доктар адкажа

І АГУЛЬНЫ, І БІЯХІМІЧНЫ

«Раскажыце, калі ласка, калі прызначаюцца агульны і біяхімічны аналізы крыві.
Сяргей Мікалаевіч, Бярозаўскі раён».

Загадчыца клініка-дыягнастычнай лабараторыі 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Ірына ЯЦЫНА патлумачыла:

— Кроў складаецца з плазмы і такіх элементаў як эрытрацыты, лейкацыты, трамбацыты і г.д. Чырвоны колер надае **гемаглабін**, які змяшчаецца ў **эрытрацытах**. Кроў дастаўляе тканкам кісларод і спажыўныя рэчывы, удзельнічае ў рэгуляцыі водна-салявога абмену і кіслотна-шчолачнай раўнавагі ў арганізме, у падтрымцы пастаяннай тэмпературы цела. Дзякуючы здольнасці **лейкацытаў** паглынаць мікраарганізмы, а таксама прысутнасці ў крыві антыцелаў, антытаксінаў і лізінаў, яна выконвае абарончую функцыю.

Кроў рэагуе на любыя змяненні ў арганізме, таму яе аналіз мае першачарговае дыягнастычнае значэнне. Вызначэнне колькаснага і якаснага саставу крыві праводзіцца, як правіла, па капілярнай крыві (з пальца).

Спецыяльнай падрыхтоўкі гэта даследаванне не патрабуе. Рэкамендуецца рабіць забор крыві раніцай нашча або як мінімум праз 2 гадзіны пасля апошняга прыёму ежы. Агульны аналіз крыві ўключае даныя аб колькасці эрытрацытаў, трамбацытаў, агульнай колькасці гемаглабіну, каляровым паказніку, колькасці лейкацытаў, суадносінах іх розных відаў, некаторыя даныя аб згусальнай сістэме крыві.

Гемаглабін. Пераносіць кісларод ад органаў дыхання да тканак і вуглякіслы газ ад тканак да дыхальных органаў. Нормы гемаглабіну для мужчын 130-160 г/л, для жанчын — 120-140 г /л. Змяншэнне канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві назіраецца пры анеміі, страце крыві. Прычына зніжэння гемаглабіну можа быць у недахопе або дрэннай засваяльнасці жалеза, вітаміну В12, фоліевай кіслаты.

Каляровы паказчык. Паказвае адносную колькасць гемаглабіну ў адным эрытрацыце. Норма — 0,85-1,15. Велічыня каляровага паказчыку мае значэнне пры вызначэнні формы анеміі.

Эрытрацыты. Утвараюцца ў косным мозгу. Норма ў мужчын — 4-5 млн у 1 мкл крыві, у жанчын — 3,7-4,7 млн. Павелічэнне колькасці эрытрацытаў звычайна адзначаецца пры захворваннях, для якіх характэрна павышаная канцэнтрацыя гемаглабіну. Змяншэнне эрытрацытаў назіраецца пры паніжэнні функцыі коснага мозга, паталагічных змяненнях у косным мозгу (лейкоз, міеломная хвароба, метастазы злаякасных пухлін і інш.). Узмоцнены распад эрытрацытаў абумоўлены гемалітычнай анеміяй, дэфіцытам жалеза і вітаміну В12, кровацвячэннямі.

Хуткасць асядання эрытрацытаў. У норме ў жанчын — 2-15 мм/г, у мужчын — 1-10 мм/г. Змяненне хуткасці асядання эрытрацытаў не з'яўляецца спецыфічным для нейкага захворвання. Аднак паскарэнне асядання заўсёды ўказвае на наяўнасць паталагічнага працэсу.

Трамбацыты. Удзельнічаюць у згусальнасці крыві. У 1 мм крыві — 180-320 тыс. трамбацытаў. Колькасць іх можа рэзка зменшыцца, што будзе праяўляцца схільнасцю да кроватачывасці (фізіялагічнай — пры менструацыі, анамальнай — пры захворваннях).

Лейкацыты. Паглынаюць бактэрыі і мёртвыя клеткі, выпрацоўваюць антыцелы. Сярэдняя колькасць лейкацытаў — 4-9 тыс. у 1 мкл крыві. У норме лейкацыты размяркоўваюцца наступным чынам: базафілы — 0,1%, эазінафілы — 0,5-5%, палачкаядзерныя нейтрафілы — 1-6%, сегментаядзерныя нейтрафілы — 47-72%, лімфацыты — 19-37%, монацыты — 3-11%. Змяненні ў гэтай лейкацытарнай форме ўзнікаюць пры самай рознай паталогіі.

Павелічэнне колькасці лейкацытаў (лейкацытоз) можа быць фізіялагічным (пры стараванні, цяжарнасці) і паталагічным (пры некаторых вострых і хранічных інфекцыях, запаленчых захворваннях, інтаксікацыях, цяжкім кіслародным галаданні, алергічных рэакцыях і ў асоб са злаякаснымі новаўтварэннямі, хваробамі крыві).

Змяншэнне колькасці лейкацытаў (лейкапенія) звязана з прамянёвым паражэннем, кантактам з шэрагам хімічных рэчываў (бензол, мыш'як і інш.), прыёмам медпрэпаратаў (цытастатычныя сродкі, некаторыя віды антыбіётыкаў, сульфаніламідаў і інш.). Лейкапенія ўзнікае пры вірусных, бактэрыяльных інфекцыях, хваробах сістэмы крыві.

Паказчыкі згусальнасці крыві. Час кровацвячэння вызначаецца яго працягласцю з павярхоўнага праколу або надрэзу скуры. Норма — 1-4 хвіліны. Час згусання ахоплівае момант ад кантакту крыві з чужароднай паверхняй да фарміравання згустку. Норма — 6-10 хвілін.

Што да **біяхімічнага аналізу**, то ён з'яўляецца галоўным для пастаноўкі дыягназаў пры вострых захворваннях печані, нырак, падстраўнікавай залозы, сэрца, многіх спадчынных захворваннях, авітамінозах, інтаксікацыі і інш. Для біяхімічных аналізаў выкарыстоўваецца пераважна вянозная кроў.

Да забору крыві неабходна правільна падрыхтавацца.

1. Кроў неабходна здаць раніцай, нашча. З апошняга прыёму ежы павінна прайсці не менш за 8 гадзін.

2. Неабходна ўстрымацца ад ужывання алкаголю і тытуню.

3. Кроў трэба здаць да прыёму лекаў.

4. Легчы спаць можна ў звычайны час, а раніцай прачнуцца не пазней за гадзіну да забору крыві.

5. Кроў здаецца да правядзення іншых відаў даследавання або фізіятэрапеўтычных працэдур.

Зніжэнне **бялку** ў крыві сведчыць аб бялковым галаданні або аб прыгнечанні працэсаў сінтэзу бялкоў пры хранічных захворваннях, запаленчых з'явах, злаякасных новаўтварэннях, інтаксікацыі і інш. Павышаная колькасць бялку ў крыві сустракаецца рэдка.

Паказчыкам **вугляводнага абмену** з'яўляецца колькасць цукру ў крыві. Яго кароткачасовае павышэнне ўзнікае пры эмацыянальным узрушэнні, стрэсавай сітуацыі, болевым прыступе, пасля прыёму ежы. Стойкае павышэнне цукру назіраецца пры цукровым дыябеце і іншых захворваннях эндакрынных залоз. Норма глюкозы крыві раніцай нашча (перыяд галадання 8-12 гадзін) 3,3 — 3,5 ммоль/л у цэльнай капілярнай крыві, 4,0 — 6,1 ммоль/л у плазме крыві, праз 2 гадзіны пасля ежы — менш за 7,5 ммоль/л.

Пры парушэнні **тлушчавага абмену** павышаецца колькасць ліпідаў і іх фракцый: трыгліцэрыдаў, ліпапратэідаў і эфіраў халестэрыну. Гэтыя ж паказчыкі маюць значэнне для ацэнкі функцыянальных здольнасцяў печані і нырак пры мностве захворванняў. Пастаяннае павышэнне ліпідаў у крыві назіраецца пры атлусценні, гепатытах, атэрасклерозе, нефрозах, дыябеце. Колькасць халестэрыну ў плазме крыві ў норме 3,6 — 5,2 ммоль/л.

З паказчыкаў **пігментнага абмену** найбольш часта праводзіцца вызначэнне розных формаў білірубіну (пігменту жоўці, прадукту распаду гемаглабіну). Утвараецца ў печані, адкуль паступае з жоўцю ў кішэчнік. У крыві сустракаюцца два віды гэтага пігменту — прамы і непрамы. Характэрнай прыкметай большасці захворванняў печані з'яўляецца рэзкае павелічэнне канцэнтрацыі прамога білірубіну, а пры механічных жаўтухах ён павышаецца асабліва значна. Пры гемалітычных жаўтухах у крыві нарастае канцэнтрацыя непрамога білірубіну.

Аналіз крыві паказвае цесную ўзаемасувязь **абмену вады і мінеральных соляў** у арганізме. Яго абязводжванне развіваецца пры інтэнсіўнай страце вады і электралітаў праз страўнікава-кішачны тракт падчас ванітаў, праз ныркі пры павышаным дыўрэзе, праз скуру пры моцным паценні. Розныя расстройствы водна-мінеральнага абмену могуць назірацца пры цяжкіх формах цукровага дыябету, сардэчнай недастатковасці, цырозе печані.

Для ацэнкі функцыянальнага стану эндакрынных залоз вызначаюць узровень гармонаў, для вывучэння спецыфічнай актыўнасці органаў — узровень ферментаў, для дыягностыкі гіпавітамінозаў — узровень вітамінаў.

Ацаніць стан вашага здароўя, правільна расшыфраваць біяхімічны аналіз крыві можа толькі кваліфікаваны ўрач.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

Паказчыкі агульнага аналізу крыві (норма)

Дарослыя мужчыны		Дарослыя жанчыны	
гемаглабін	130 — 160 г/л	гемаглабін	120 — 140 г/л
эрытрацыты	4 — 5,1х1012/л	эрытрацыты	3,7 — 4,7х1012/л
каляровы паказчык	0,85 — 1,15	каляровы паказчык	0,85 — 1,15
рэтыкулацыты	0,2 — 1,2%	рэтыкулацыты	0,2 — 1,2%
трамбацыты	180 — 320х109/л	трамбацыты	180 — 320х109/л
хуткасць асядання эрытрацытаў (САЭ)	1 — 10 мм/ч	хуткасць асядання эрытрацытаў (САЭ)	2 — 15 мм/ч
лейкацыты	4 — 9х109/л	лейкацыты	4 — 9х109/л
Формула крыві:	палачкаядзерныя нейтрафілы 1—6% сегментаядзерныя нейтрафілы 47—72% эазінафілы 0—5 % базафілы 0—1 % лімфацыты 18—40% монацыты 2—9%	Формула крыві:	палачкаядзерныя нейтрафілы 1—6% сегментаядзерныя нейтрафілы 47—72% эазінафілы 0—5% базафілы 0—1% лімфацыты 18—40% монацыты 2—9%

■ АўтоГраф

ХАЧУ АЎТАМАБІЛЬ!

Кошт пры куплі машыны — зусім не галоўны фактар

Аўтамабільны рынак Беларусі «штарміць» тым ці іншым чынам ужо колькі гадоў запар. Змены ў заканадаўстве прама і ўскосна паўплывалі на кошты аўтамабіляў, густы пакупнікоў і стратэгіі аўтаўладальнікаў. Ці варта ў будучым чакаць «штылю» ў гэтым накірунку? Што падштурхоўвае патэнцыяльных пакупнікоў усё часцей прыглядвацца да дылерскіх цэнтраў? Як зменяцца цэны на першасным і другасным рынку з-за ўвядзення ўтылізацыйнага збору? Пра гэта і іншае карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з экспертам Міжнароднага аўтамабільнага холдынга «Атлант-М» Дзмітрыем ПЕРЛІНЫМ.



Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

— Апошнія некалькі гадоў аўтарынак Беларусі пастаянна перажывае пэўныя коштавыя змены. То павышэнне «растаможкі», то ўвядзенне новых падаткаў і збораў, што адлюстроўваецца на кошце аўто. Як уведзены нядаўна ўтылізбор можа зноў паўплываць на першасны і другасны рынак?

— Хоць утылізацыйны збор закрануў абедзве сферы ў нашай ступені, рынак патрыманай тэхнікі ўсё роўна адыграецца і возьме сваё. Бо прадаўцы такіх машын, гледзячы, як падаражэлі новыя аўто, таксама не будуць спаць у шапку. Для іх гэта пажаданы нюанс на рынку, які зможа павысіць даходнасць бізнесу. Што датычыцца новых, то на іх цане ўтылізацыйны збор практычна ніяк не адлюструецца. Па той прычыне, што ўтыльзбор на аўтамабілі, якія збіраюцца за мяжой, у некаторай ступені, а то і ў поўнай меры закране зніжэнне мытных плацяжоў. Таму на некаторыя аўто цэны стануць нават меншымі, бо падзенне мытнай пошліны ў большай ступені кампенсуе памер утыльзбору. А далей ужо рынак пакажа, ці знізяцца цэны на аўто, што выпускаюцца не ў краінах Мытнага саюза. Што датычыцца аўтамабіляў, якія збіраюцца ў Расіі, то насуперак агульнапрынятаму меркаванню, што «гуляе» ў СМІ, быццам бы сума збору будзе

Цана аўто складваецца не з кошту жалязяк, пластмасак і іншага. Перш за ўсё гэта кошт кампетэнцый, канструктарскіх і доследна-выпрабавальных работ.

спаганяцца двойчы: адзін раз пры выпуску ў Расіі, другі — у нас, магу сказаць: нічога падобнага! Утыльзбор спаганяецца ў краіне прызначэння — гэта значыць, у Беларусі. У Расіі — толькі ў выпадку свабоднага звароту на тэрыторыі РФ. На экспарт ён не распаўсюджваецца. Паўплываць на кошт аўто можа і паслабленне расійскага рубля. Гэта дазваляе нашым дылерам кампенсаваць памер збору адпаведным пераглядам прайсаў. Да таго ж трымаць цэны на ранейшым узроўні дапамагае стымуляванне попыту на новыя аўто — у прыватнасці, на Volkswagen. Напрыклад, Volkswagen Polo седан адназначна не падаражэе. Наадварот, на найбольш запатрабаваныя камплектацыі кошт можа знізіцца амаль да 1000 долараў.

— Наколькі сённяшнія перадумовы і акалічнасці спрыяльныя для таго, каб беларускі аўтарынак перамясціўся з другаснага сегмента ў першасны?

— Тут пытанне, хутчэй, веры, што лепш: новы аўтамабіль у сегменце ад 12-13 да 20 тыс. долараў ці патрыманы за тыя ж грошы? Пытанні веры я звычайна не абмяркоўваю: яны вельмі блізкія да рэлігійных. Проста скажу і, напэўна, не памылюся, што 95% фізасоб, якія купляюць новыя аўто, — людзі, якія апякліся на патрыманых аўтамабілях. Паглядзім, напрыклад, на рынак Германіі. 99% машын, якія там набываюць, прадаюцца новымі. У нас, калі год выпуска аўто свежы, а прабег невялікі, гэта становіцца адназначным і бясспрэчным сінонімам слову «добра». У Германіі ж скажуць: «Найн, пачакайце». Невялікае пытанне: а як з тэхнічным станам? Любы немец, які прадае аўто ў добрым тэхнічным стане, заўсёды гатовы падмацаваць свае словы дакументамі — сэрвіснымі кніжкамі, чэкамі з СТА і г.д. У выніку атрымліваецца, што машыны з аднолькавым прабегам, якія прадаюцца ў Беларусі і Германіі, у апошняй каштуюць столькі ж, колькі ў нас тая ж самая патрыманая «з вушамі, лапамі і хвастом» замест дакументаў. Цэннік там і тут пасля мытных плацяжоў аднолькавы. Людзі, якія ўжо на гэтай справе апякліся, не хочуць гуляць у латарэю, таму з года ў год папаўняюць клуб уладальнікаў новых недарагіх машын. Людзі, звязаныя з інтэлектуальнай працай, інжынерыяй, кіраўнікі і тыя, хто часта мае зносіны з замежнікамі, не надта гоняцца за патрыманым «прэміумам». Сёння літаральна на вачах назіраецца вялізны рост сегмента красавераў. Ад 20-25 тыс. долараў, дзе правяць баль недарагія французскія машыны, і 30-45 тысяч, дзе ў топе продажаў карэйскія, нямецкія і японскія аўтамабілі. Шчыра кажучы, я думаю, што паступова тэндэнцыя да набыцця новых аўто, няхай не вельмі прэстыжных марак, за роўную цэну з патрыманымі, стане больш яўнай.

— За «бэушкай», зразумела, пагоня будзе, нас так адразу не пераключыш, не перавыхаваеш. 20 гадоў, напоўненыя суцэльным б/у, у адзін момант не перакрочыш.

— Асноўны крытэрый, па якім сёння вызначаюцца густы пакупніка, — кошт?

— Гэта вялікі зман. Як паказваюць розныя даследаванні, у тым ліку і ў Беларусі, цана з'яўляецца вызначальным фактарам не больш чым для 5-10% пакупнікоў. Чалавек купляе не цану — ён купляе прадукт. Нават не прадукт, а тыя перавагі, задавальненне, практыцызм, які надасць яму гэты прадукт. Іншая справа, што на рынку заўсёды ёсць аналагі па розных цэнах. Справа не ў тым, што часцей за ўсё купляюць недарагое. Красавераў у Беларусі, напрыклад, на вялізнай вазе прадаецца больш, чым танных машын. Ці прыкладна столькі ж. Калі паглядзець на продажы аўто ў роўных сегментах, то на першым месцы будуць не самыя танныя камплектацыі. Цана, вядома, з'яўляецца важным фактарам, але не галоўным.

— Ці ёсць сэнс ісці дылерам у рэгіёны — напрыклад, у буйныя раённыя цэнтры?

— Вядомыя аўтарытэтныя дылеры ўжо даўно прысутнічаюць практычна ва ўсіх абласных гарадах. Маркі, якія займаюць першыя месцы па продажах (Volkswagen, Renault, Kia), маюць уласныя пункты ў рэгіёнах, працуючы ад беларускіх імпарцёраў ці ў якасці субдылераў. Каля 50% продажаў прыходзіцца на Мінск, астатняе — на рэгіёны, што сапраўды нямала. Ісці далей, углыб, не мае сэнсу. Чалавеку, які хоча купіць новы аўтамабіль у рэгіёне, трэба праехаць максімум 100 км да бліжэйшага дылерскага цэнтра. Так што дылерскі корпус пранікаць у райцэнтры Беларусі пакуль не плануе.

95% фізасоб, якія купляюць новыя аўто, — людзі, якія апякліся на патрыманых аўтамабілях.

— Сістэма trade-in у Беларусі працуе практычна 3 гады. Ці ажывіла яна беларускі аўтарынак і наколькі папулярнай стала сярод беларусаў?

— Не менш за траціну продажаў новых аўтамабіляў, у залежнасці ад брэнда, праходзіць па гэтай сістэме. Сярод прэміяльных марак гэты лік можа дасягаць і паловы. Таму што чалавек, які можа дазволіць сабе купіць аўто за 45-50 тысяч, і дагэтуль ездзіў не на каламажцы з чатырма калёсамі. Калі аўтамабіль дастаткова ліквідны і ўяўляе каштоўнасць на другасным рынку, то яго, вядома, возьмуць у залік новага. Гэтая сістэма сапраўды працуе. І чым больш будуць набывацца новых аўто, тым інтэнсіўней яна пачне развівацца. Як правіла, на свой першы аўтамабіль без прабегу беларус прыходзіць з «бэушкай», увезенай аднекуль. Яе стан можа вагацца ад дзіўнага да мудрагелістага, што потым абяцае немалыя праблемы пры дальнейшай рэалізацыі ўжо з дылерскага цэнтра. Калі ў Беларусі рынак новых аўто пачне развівацца больш актыўна, могуць з'явіцца і такія схемы, як buyback. У Беларусі пакуль мала пра гэта чулі, але ва ўсім свеце яны ўжо працуюць для пастаянных кліентаў. У нас жа і пастаянных кліентаў пакуль не назіраецца. У чым сутнасць байбэку? Калі пастаянны аўтаўладальнік прыходзіць да дылера, да якога звяртаўся па пакупку і абслугоўванне аўто яшчэ яго дзед, пачынаецца прыкладна такая размова: «Я езджу на гэтай машыне тры гады, наязджаю 60000 км. 30000 еўра яна каштуе, за гэты час згубіць 10000». І ўжо пры набыцці наступнага новага аўтамабіля пастаянны кліент выплачвае не кошт аўто, а кошт страты. Прычым у дадатак можа аформіць на гэтую суму крэдыт пад 5% гадавых. Рызыка не высокая. У Беларусі, вядома, яшчэ не той узровень рынку, не той таварны паток, не настолькі лёгкае заканадаўства і не такія мінімальныя рызыкі, таму нам байбэк пакуль не «пагражае».

— Сёння шмат размоў вядзецца пра канкурэнцыю з кітайскімі вытворцамі і іх падрыхтоўку да «экспансіі» на рынак Усходняй Еўропы. Ці ёсць у кітайцаў шанцы і дзейсныя рэсурсы, перадумовы, каб адваяваць сабе гэты ўстойлівы сегмент?

— Калі паглядзець на гісторыю сусветнага аўтапрама (напрыклад, японскага), яму, каб выйсці на ўзровень міжнароднай канкурэнтаздольнасці, спатрэбілася 40 гадоў. 40 гадоў — той часавы прамежак, які неабходны для атрымання прафесійных кампетэнцый, іх сістэматызацыі, прымянення на працягу пэўнага тэрміну і распаўсюджвання на прадукт. Пацвярджэнне гэтай думкі я бачу на карэйскіх вытворцах. Перайшоўшы ў канцы 1960-х гадоў ад выпуску веласіпедаў да аўтамабіляў, яны дасягнулі ўзроўню сусветнай канкурэнтаздольнасці дзесьці ў 2007 годзе. Якраз 40 гадоў. Кітайцам нікуды не падзецца ад гэтага доўгага працэсу. Няхай і з'яўляюцца навіны пра тое, што новая марка кітайскага вытворцы «Корас» атрымала 5 зорак, шмат узнагарод і іншае. Аднак трэба ўлічваць тое, што спраектавана яна ўсё ж немцамі, англічанамі і французамі. Цалкам. І пры гэтым каштуе даражэй, чым Kia ў Еўропе. Па той простай прычыне, што, сабраная ў Кітаі, яна зроблена па лекалах BMW, Volkswagen. А для ўсіх кітайскіх аўтавытворцаў еўрапейцаў не хопіць. Да сусветнага ўзроўню кітайскаму аўтапраму крочыць яшчэ 10-15 гадоў. І тое яго лепшым прадстаўнікам. На сённяшні момант, калі паглядзець на тэхніку спрадвечна кітайскіх брэндаў, яна нагадвае карэйскія аўто канца 1980-х гадоў. Запэўніванні пра тое, што гэты рухавік скапіраваны з Mitsubishi ці Toyota, яшчэ не азначаюць, што ён такі ж даўгавечны, эканомны і надзейны. Уплыў на перараз-меркаванне попыту Кітай можа аказаць у небагатых краінах. Цікава, што ў самім Кітаі самыя запатрабаваныя там аўтамабілі: Volkswagen (на першым месцы), на другім — General Motors, потым — французскія і японскія аўто. Кітайцы праводзяць экспансію на знешнім рынку, зарабляючы грошы выключна на экспарце. Не трэба забываць і пра тое, што, як толькі кітайцы выйдуць на сусветную арэну, яны выйдуць і на парытэт па цэнах. Цудаў не бывае. Каб зрабіць якасны прадукт, трэба заплаціць рабочым добры заробак, правесці доследна-канструктарскія работы, выканаць адпаведны цыкл выпрабаванняў, атрымаць належныя сертыфікаты. Гэта патрабуе вялікіх кампетэнцый, працяглага часу і буйных капіталаў. Цана аўто складваецца не з кошту жалязяк, пластмасак і іншага. Перш за ўсё гэта кошт кампетэнцый, канструктарскіх і доследна-выпрабавальных работ.

Любоў КАСПЯРОВІЧ

■

РАГАЧОЎСКІ ФРОНТ

Пасля вызвалення ў старажытным горадзе ацалелі толькі два двухпавярховыя будынкі

Ваенная гісторыя Рагачова незвычайная. У далёкім 1941-м ён скарыўся немцам толькі з другой спробы. Ужо палі перад захопнікамі Смаленск, Віцебск, Орша, а над Рагачовам па-ранейшаму працягваў лунаць савецкі сцяг. І вызвалялі яго ажно ў тры этапы. Рэдкі горад яшчэ так доўга знаходзіўся фактычна на лініі фронту. Таму ў старажытным Рагачове амаль не засталося архітэктурных помнікаў. Але па ўсім Рагачоўскім раёне стаяць іншыя помнікі — тым, у каго ў ваеннае ліхалецце захопнікі адабралі жыццё. У 99 воінскіх пахаваннях апошні спачын знайшлі каля 20 тысяч чалавек — больш, чым насельніцтва Рагачова да вайны.

Немцы ўварваліся ў Рагачоў ужо 3 ліпеня. Аднак доўга яны там сябе гаспадарамі не адчувалі. Ужо літаральна праз дзесяць дзён Рагачоў і Жлобін адбіў у ворага 63-і стралковы корпус (пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Леаніда Пятроўскага), які фарсіраваў Дняпро. Дзякуючы гэтаму контрудару немцаў адкінулі на захад на трыццаць кіламетраў, дзе і стрымлівалі іх націск без малога сорак дзён. Тым самым байцы генерала Пятроўскага сарвалі імклівы наступ фашыстаў на Маскву. У Рагачове ж поўным ходам ішла эвакуацыя чыгуначнага транспарту, прамысловага абсталявання, матэрыяльных каштоўнасцяў. Паспелі вывезці ў глыб краіны і частку мірных жыхароў.

13 жніўня, калі корпус генерала Пятроўскага быў ужо акружаны, праз лінію фронту прабіўся аднамесны самалёт. Яго Масква выслала спецыяльна, каб эвакуяваць палкаводца. Але Пятроўскі адправіў замест сябе ў тыл цяжка параненага байца. І загінуў праз чатыры дні пры спробе прарыву з акружэння. Вайсковая легенда гаворыць: немцы пахавалі яго з ушанаваннем. Паставілі на яго магілцы крыж, дзе напісалі на рускай і нямецкай мовах: «Тут пахаваны рускі генерал Пятроўскі»...

КРЫВАВЫЯ БЕРАГІ ДРУЦІ І ДНЯПРА

Фашысты знішчылі за тры няпоўныя гады ўсю прамысловасць раёна: завод кансерваванага малака, лесазавод, кардонную фабрыку, ільнозавод, спіртзавод, хлебазавод, цагельню і 22 прамысловыя арцелі. Былі разбураны настаўніцкі інстытут, школы трактарных механікаў і медсясцёр, рамеснае вучылішча, 51 школа, 5 дзіцячых дамоў, друкарня, 52 бібліятэкі... У руіны быў ператвораны тэатр «Мадэрн», які знаходзіўся непадалёк ад цяперашняга аўтавакзала. Дзякуючы яму Рагачоў яшчэ ў часы Расійскай імперыі стаў адным з першых павятовых гарадоў, куды прыйшло тэатральнае майстэрства...

— Паглядзіце на схематычную карту Рагачова пасля вызвалення. Бачыце, як шмат на ёй чорнага колеру? — паказвае дырэктар Рагачоўскага музея народнай славы Міхаіл Ларычкаў. — Дык вось, немцы спалілі і разбурылі тут 1230 жылых дамоў. Ад камбіната, дзе вырабляюць вядомае ўсім згушчанае малако, не засталося амаль нічога. А яго руіны разбіралі да 1947 года... Каб уявіць сабе маштаб разбурэнняў, дастаткова сказаць, што ў горадзе жыло да вайны каля 17 тысяч чалавек. Ад даўняй архітэктуры ацалелі толькі два двухпавярховыя будынкі. Самы стары з іх, жылы, знаходзіцца адразу каля аўтавакзала. Другі ж — тут, побач з намі. У ім да рэвалюцыі размяшчалася земская ўправа. Цяпер жа ў ім праходзіць капітальны рамонт, пасля якога тут размесціцца Дом кнігі. І крыху прыватных дамоў засталося на берагах Друці і Дняпра...

Берагі дзвюх рэк, на якіх стаіць горад, сталі месцам для нечуваных для горада зверстваў за ўсю яго гісторыю. Аб гэтым крычыць кожнае слова ў акце рагачоўскай раённай камісіі па расследаванні злодзействаў, здзейсненых захопнікамі на тэрыторыі раёна...

У першы тыдзень лістапада 1941 года ў рве за кардоннай фабрыкай на беразе ракі Друць фашысцкія каты забілі каля трох тысяч грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці. У Рагачове не засталося пасля гэтага пагрому ніводнага яўрэя. Перад расстрэлам каты доўга здзекаваліся са сваіх ахвяр. Мужчын, жанчын і дзяцей фашысты трымалі ў сырых халодных падвалах колішняга склада, адкуль кожны дзень іх выганялі на цяжкія фізічныя працы. Прыгавораныя да смерці без суда прыбіралі камяні і цэглу, вазілі на сабе пясок, ваду... Жанчыны і падлеткі рукамі выграбалі бруд з прыбіральняў, на якіх быў надпіс: «Толькі для немцаў».

Маленькіх дзяцей немцы бралі за ногі, білі галавой аб мёрзлую зямлю і кідалі ў роў... А вясной 1942 года, калі сышоў снег, гэты роў размыла вадой. І па Друці паплылі сотні трупаў. Каб іх прыбраць, фашысты выгналі на прымусовыя працы ўсё мясцовае насельніцтва. Людзі лавілі целы забітых баграмі і голымі рукамі, закопвалі іх у зямлю або палілі на вогнішчах пад прыцэлам нямецкіх аўтаматаў.

На беразе Дняпра, побач са старымі могілкамі, знаходзіцца сасновы бор. Мясцовыя жыхары называюць яго «долам смерці». Туды вяла сцежка, пратаптаная сотнямі тых, каго з рагачоўскага гестапа вялі на расстрэл. Загадзя там выкопвалі глыбокую яму. Немцы прыводзілі да яе асуджаных на смерць, ставілі ў рад і стралялі. Целы

Былая партызанка Марыя ЛАПІЦКАЯ.

ў яме засыпалі тонкім слоем зямлі. І гэты вычварэнскі канвеер працаваў штодня. Усяго такіх ям у «доле смерці» налічылі дзесяць. Памяць загінулых ушанаваў абеліск, які стаіць у самым цэнтры сасновага бору...

Заўтра спаўняецца 70 гадоў, як войскі 65-й Арміі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Паўла Батава вызвалілі 33,5 тыс. вязняў Азарыцкага лагера смерці. Многія з іх, аднак, хутка памерлі праз тыф...

— Летась у Рагачоў прыязджаў дырэктар праграм буйнога амерыкана-ізраільскага Дабрачыннага яўрэйскага фонду «Аві Хай» у краінах СНД і Балтыі Дэвід Розенсан, — прыгадвае Міхаіл Ларычкаў. — З іўрыту назва арганізацыі перакладаецца «Ці жывы бацька мой»... Ён знайшоў у спісе забітых на беразе Друці свайго дзеда па прозвішчы Брук. Доўга стаяў і плакаў там... А вось фотаздымак палаючага хлява. 28 лістапада 1943 года фашысты сагналі ў хлеў каля 200 чалавек, якіх спалілі зажыва. Тых, каму ўдалося выбегчы з полымя, яны падстрэльвалі і кідалі назад у агонь... Той жа лёс спасціг адзінаццаць рагачоўскіх вёсак. Колькі ж усяго было расстраляна і спалена людзей, не ведае ніхто. Нават праз семдзесят гадоў жалобныя спісы забітых працягваюць папаўняцца. Толькі летась у іх з'явілася 192 новыя прозвішчы.

З горада і раёна немцы масава ўганялі людзей. Адных накіроўвалі на прымусовыя работы да баўэраў. Другія трапілі ў анэксаваную Чэхаславакію на працу на ўранавых рудніках. Трэціх кідалі ў лагеры смерці — Бухенвальд, Асвенцым, Заксенхаўзен, Азарычы...

«ІДУЦЬ ЦЯГНІКІ Ў АЗАРЫЦКІ ЛАГЕР АД СЁННЯ І БЕЗУПЫНКУ...»

Пасля таго як савецкія войскі перайшлі ў 1943 годзе ў наступленне, нямецкае камандаванне перамяніла тактыку і пачало выкарыстоўваць у якасці «жывога шчыта» мірных людзей. Каля пярэдняй лініі абароны акупанты абносілі калючым дротам вялікі ўчастак зямлі, на які зганялі тысячы мясцовых жыхароў. Перад гэтым у новаўтвораны лагер завозілі хворых на сыпны тыф. Рабілася гэта з мэтай распаўсюджвання эпідэміі ў авангардных злучэннях Чырвонай Арміі і зрыву яе далейшага наступлення.

Тры з такіх лагераў смерці былі створаны на захадзе Гомельскай вобласці, паблізу ад пасёлка Азарычы. Зрэшты, дамо слова дакументам, змешчаным у зборніку матэрыялаў «Нюрнбергскі працэс над галоўнымі нямецкімі ваеннымі злачынцамі».

«19 сакавіка 1944 года наступаючыя часці Чырвонай Арміі ў раёне мястэчка Азарычы Палескай вобласці Беларускай ССР знайшлі на пярэднім краі нямецкай абароны тры канцэнтрацыйныя лагеры, у якіх знаходзілася больш за 33 тысячы дзяцей, непрацаздольных жанчын і старых. Першы з гэтых лагераў знаходзіўся на балоце каля пасёлка Дзерць. Другі — за 2 кіламетры на паўночны захад ад мястэчка Азарычы. Трэці — на балоце за 2 кіламетры на захад ад вёскі Падасіннік.

Лагеры ўяўлялі сабой адкрытую пляцоўку, абнесеную калючым дротам. Подступы да іх былі замініраваны. Ніякіх пабудоў, нават лёгкага тыпу, на тэрыторыі лагераў не было. Зняволеныя размяшчаліся тут жа на зямлі. Многія з іх, што не маглі ўжо рухацца, без памяці ляжалі ў брудзе. Зняволеным было забаронена разводзіць вогнішчы, збіраць галлё для падсцілкі. За самую нязначную спробу парушыць гэты рэжым гітлераўцы расстрэльвалі людзей...»

Ужо 21 год у Рагачове дзейнічае гарадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму», у якую аб'ядналіся колішнія вязні Азарыцкага лагера смерці. Узначальвае яе Ала Осіпава. Максімальнага росквіту арганізацыя дасягнула праз тры гады, калі колькасць яе ўдзельнікаў перавысіла адзнаку ў паўтары тысячы. Але старыя людзі паціху адыходзяць у іншы свет. І цяпер ад былой колькасці членаў арганізацыі засталося толькі траціна...

— Мы жылі ў вёсцы Лугавая Вірня Жлобінскага раёна, — успамінае Ала Осіпава. — Два з паловай гады пад акупацыяй неяк працягнулі. А найбольшыя пакуты пачаліся напрыканцы лютага 1944-га. Усіх жыхароў нашай вёскі сагналі спачатку ў стацыянарны лагер у Жлобіне. Калі нас выганялі з хаты, маці захапіла крыху ежы, дакументы, фотаздымкі і кусок зялёнай тканіны. Я тады была малая, таму гэтыя некалькі дзён у памяці не адкладаліся. Праз гэты час нас пагрузілі ў таварныя вагоны і павезлі да станцыі Халоднікі. Ад станцыі нас гналі ў Азарыцкі лагер пешшу праз дваццаць кіламетраў па раллі ды балоце. З сям'і нас было сямёра: я, мая сястра, маці, цётка з дачкой і бабуля з дзядулем. Мне ж тады было каля чатырох гадоў. Але ў памяць урэзаліся жудасныя фрагменты...

Мы ішлі па нейкім полі. І я пачула трэск. Пытаюся ў маці: маўляў, што гэта? Далей пачынаўся гай, каля якога нешта гарэла. Маці не давала мне зірнуць туды, але ўсё-такі я ўпотай паспела гэта зрабіць. Там ляжалі штабелі, у якіх рады бярвення чаргаваліся з радамі нябожчыкаў...

Між чыгункай і лагерам раскінулася балота. Перад ім была канава шырынёй метра паўтара, у якой плаваў лёд. Адкормленыя немцы яе проста пераскоквалі, а мы брылі ў халоднай вадзе. На тым баку канавы стаяў немец. Ён падышоў, забраў клунак і кінуў увесь наш невялічкі скарб на дарогу. Так мы і ішлі па дакументах, фотаздымках... Немец мяне паклаў на купіну. А маці з сястрой падхапіў і перамахнуў з імі праз канаву. І ўжо


Падпалкоўнік у адстаўцы Іван АНЦІПАЎ на алеі Герояў-рагачоўцаў.

пасля мне маці казала: «Я глядзела яму ў вочы і думала: аддасць ён цябе ці не?» У рэшце рэшт яна пачула рэзкае: «Матка, кляйн!» Маўляў, забірай... Справа ў тым, што немцы стралялі ў дзяцей там жа, на той пераправе. Вось так у той багне і засталіся навек пяць дзяўчынак з Лугавой Вірні. З тых, хто нарадзіўся ў нас у 1940 годзе, я засталася толькі адна...

Ежы і вады нам амаль не давалі. Грэліся адно каля аднаго, седзячы шчыльнай кучкай у ямцы пад хвойкамі. Выжылі мы дзякуючы дзеду Сямёну. Ён паспеў насыпаць у адзін з клункаў кілаграмаў з восем грэчкі. У бляшанкі з-пад кансерваў налівалі талую ваду. Употай ад немцаў разводзілі маленькі агеньчык, каб толькі яго не заўважылі: за гэта яны расстрэльвалі. І варылі саматужную вадкую зацірку...

Немцы пускалі зброю ў ход з-за любой дробязі. Так загінула маці вязніцы Галіны Грышынай, рукамі якой пад нашым памятным знакам захавана зямля з Азарычаў. У іх сям'і было трое дзяцей. Маці пайшла да калючага дроту наламаць хоць нейкага галля, каб штосьці разагрэць. Немец паласнуў па ёй аўтаматнай чаргой на вачах у дзяцей... Так здарылася, што ў вайсковых злучэннях, якія вызвалялі Азарычы, служыў яе бацька. І хтосьці яму сказаў: там у ямачцы памяраюць твае дзеці! Бацька перапраўіў малых хутчэй да ўрачоў, але ў хлопчыка дактары былі вымушаны ампутаваць абедзве нагі...

Раз-пораз над лагерам праляталі нямецкія самалёты, якія распылялі нейкі зялёны парашок. Што за ён — я не ведаю. Але парашок гэты лез паўсюль, мы ад яго задыхаліся... Спалі мы на нябожчыках. Дзед Сямён клаў трупы, на іх кідаў хвойныя галінкі, а наверх слаў нейкую брудную анучку — вось так выглядаў наш ложак. Калі раніцай мы прачыналіся, на нас быў пласт снегу. На шчасце, доўга гэты жах не цягнуўся: праз месяц нас вызвалілі. Яшчэ паўтара года я не магла ступіць і кроку: ножкі счарнелі ад марозу...

У Азарычы гналі ўсіх без разбору — малых, старых, хворых, нямогламых... Трапіла туды і цяжарная жанчына. Нараджаць сына ёй давялося там. Медыцынскай дапамогі — абсалютны нуль. Парадзіха сканала праз некалькі гадзін. А хлопчыка загарнулі ў чыюсьці целагрэйку і пакінулі на ноч. Раніцай яе разгарнулі, і малы закрычаў... Кармілі яго чым маглі. На шчасце, яго маленькі арганізм выстаяў перад голадам і холадам. Цяпер гэты чалавек жыве ў Жлобіне.

А дзед Сямён, наш ратаўнік, неўзабаве загінуў. Было гэта так. Аднойчы ён прыйшоў да нас і кажа: «Там хлеб немцы прывезлі». Павалакліся мы туды і ўбачылі велізарную кучу з нейкай агіднай зеленаватай масы, толькі аддалена падобную да звыклага хлеба. Яе высыпалі ў бруд. Немцы, якія стаялі на вяршыні гэтага «пагорка», кідаліся камякамі гэтага эрзац-хлеба ў людзей навокал. Ды не проста раскідвалі, а цэліліся ў вязняў. Шмат людзей вярнулася ад той хлебнай кучы з рассечанымі галовамі. Камякі ж па форме і масе нагадвалі камяні... Дзядулю адзін з гэтых камякоў прабіў галаву. Ён злёг. Але чым мы маглі яго палячыць за калючым дротам... Прыкладвалі да раны снег, але, вядома, ніякага выніку ад такога «лячэння» не было. Да вызвалення ён дажыў. А вось да бліжэйшага шпіталя мы так яго і не данеслі — дзед Сямён памёр у вёсцы Бронніцы Буда-Кашалёўскага раёна...

Вызвалялі нас раніцай. Аднекуль даносілася кананада. Нашы салдаты адчынілі вароты і выводзілі нас па вузенькай сцежцы. Тэрыторыя навокал была замініравана. Мы ішлі калонай, ступаючы па слядах тых, хто прайшоў раней...

Наш шыкоўны новы дом, пабудаваны перад самай вайной, быў разбураны. Таму жылі ў бункеры. Па абодвух баках былі прымацаваны нары. Пасля азарычскіх жахаў і гэтае «жытло» з узроўнем вады па калена здавалася прымальным варыянтам. Сястра трызніла ад тыфу, мяне калаціў адзёр. Нават самастойна вылезці на свежае паветра я не магла — перасталі дзейнічаць ногі. Мяне выносіла маці...

Ала Осіпава выдала кнігу «Плач аб украдзеным дзяцінстве», у якой змешчаны ўспаміны тых, хто ў маленстве

Дырэктар музея народнай славы Міхаіл ЛАРЫЧКАЎ распавядае пра загінулых у Азарыцкім лагеры смерці.

перажыў акупацыю, звесткі аб вывезеных у Германію і забітых мясцовых жыхарах. Тры гады яна займалася праектамі «Месца сустрэчы — дыялог» і «Жыццё тут і цяпер». Іх праграмы скіраваны на тое, каб пажылыя людзі не заставаліся сам-насам са сваімі праблемамі, каб яны расказвалі маладым пра тое, што перажылі ў маленстве, маглі сябе рэалізаваць у нейкім занятку. Для пенсіянераў арганізоўваюцца шматлікія экскурсіі па гістарычных месцах Беларусі — у Слаўгарад, Гомель, Мір, Нясвіж, Полацк... Штогод яны ездзяць у каплічку, пабудаваную на месцы Азарыцкага канцлагера...

ЖАНОЧЫ ТВАР РАГАЧОЎСКІХ ПАРТЫЗАН

У музеі народнай славы ў Рагачове ёсць вельмі цікавы экспанат. На першы погляд, у ім няма нічога адметнага — звычайны пень, якіх у кожным лесе можна сустрэць шмат. Ды вось толькі гэты пень незвычайны. Ён служыў у якасці своеасаблівай партызанскай паштовай скрынкі. Ляжаў ён на ўзлеску, прыкрыты галлём. Партызанскі сувязны, які дзейнічаў у горадзе, клаў у гэты пянёк зашыфраваную запіску з якімсьці паведамленнем. І праз пэўны час пасланне аказвалася ўжо ў атрадзе...

У раёне тры гады барацьбу з немцамі вялі адразу дзве партызанскія брыгады: 8-я Рагачоўская і 10-я Журавіцкая. Колькасць іх удзельнікаў перавышала чатыры тысячы чалавек. У апошнюю з іх пятнаццацігадовай дзяўчынай прыйшла Марыя Лапіцкая. Усе тыя, хто гуляў у святочны тыдзень па цэнтральнай вуліцы горада, маглі пабачыць яе выяву на велізарным бігбордзе...

У раёне тры гады барацьбу з немцамі вялі адразу дзве партызанскія брыгады: 8-я Рагачоўская і 10-я Журавіцкая. Колькасць іх удзельнікаў перавышала чатыры тысячы чалавек.

— Я нарадзілася 9 мая, акурат у Дзень Перамогі, — з гумарам гаворыць былая партызанка Марыя Лапіцкая. — Толькі вось было гэта ў 1926 годзе. Родам я з вёскі Вялікія Стралкі Рагачоўскага раёна. Але яшчэ ў даваенны час так склаліся абставіны, што давялося пераехаць у вёску Красніцу.

Партызанскія атрады на Рагачоўшчыне пачалі ўзнікаць адразу пасля акупацыі раёна. Аднак у лесе, вядома, вялікую харчовую базу не створыш. Маці Марыі Афанасьеўны разам з бабай Васілінай пяклі ў Красніцы хлеб для партызан. Ды працягвалася гэта нядоўга.

— Знайшоўся здраднік, які паведаміў пра іх у паліцыю, — расказвае жанчына. — Данёс, што сям'я партызанская. Забралі фашысты не толькі маці, але і суседку Еўдакію, якая да партызан не мела ўвогуле ніякага дачынення. Прыехаў рагачоўскі бургамістр Сідарэнка, і ўсіх кудысьці павялі. Як пасля аказалася, на сход у сельскі клуб. Бачым: на ўваходзе стаіць паліцай з вінтоўкай. Ужо развітваліся з жыццём — думалі, што вядуць на расстрэл. Аднак нейкім цудам усё ж ацалелі.

Варыянтаў не было — толькі ўцякаць у лес. Я два дні прасядзела ў ціхім закутку, а маці падняла гвалт: пайшла дачка ў Рагачоў па соль і запалкі і не вярнулася. Тады шмат людзей вось так знікала падчас аблаў...

А ў самым пачатку 1942 года я трапіла ў 10-ю Журавіцкую брыгаду. Дзве з паловай тысячы людзей у ёй змагаліся са зброяй у руках. Па мяне прыехала камісар Таццяна Карніенка разам з маім стрыечным братам. Яны пасадзілі мяне ў санкі і павезлі ў лес...

У брыгадзе я трапіла ў медсанбат. Увесь час была пры параненых, вучылася аказваць дапамогу: спыніць кровацячэнне, перавязаць рану. Было шмат трафейнай ваты, бінтоў, лекаў. Некаторыя байцы ўмелі чытаць па-нямецку — гэтую ж мову да вайны вывучалі паўсюдна. Таму яны пісалі нам на этыкетках па-беларуску ці па-руску, што ж гэта за лекі такія таямнічыя ў бутэлечках... Аднойчы я не вытрымала і напрасілася на сапраўднае задан-

партызанская зона. Але, што адметна, на другі год вайны нас акупанты таксама не кранулі. А вось у 1943-м, калі фронт прыметна пачаў рухацца бліжэй да Беларусі, немцы азвярэлі. Калі яны з'яўляліся ў вёсцы і бачылі хоць каго жывога, адразу стралялі ва ўпор... Таму ў сакавіку ўсё наша Чорнае, у якім жыло да вайны больш за дзве тысячы чалавек, пайшло ў лес. Сядзелі мы там, пакуль не прыйшлі нашы. Жылі ў лесе ў антысанітарных умовах. Палохаліся кожнага шолаху. Харчаваліся ягадамі, грыбамі... Калі-нікалі хадзілі на поле пажывіцца гнілой бульбінай, здабыць пару каласкоў. А над намі свісцелі кулі... І вось увечары 18 лістапада нашу вёску вызвалілі. Вярнуліся мы дахаты ўвечары. Фронт у той дзень прасунуўся на захад ад Чорнага на сем-восем кіламетраў.

— Праз пару дзён пасля вызвалення пачалі мабілізаваць нашу моладзь. І так здарылася, што я тут жа зваліўся, захварэў на тыф. Усе пайшлі на фронт, а я накіраваўся ў ложак, — горка жартуе ветэран. — Я быў першы хворы. І пасля ў вёсцы пачалася эпідэмія. Праляжаў я без памяці дзесьці месяц. Потым яшчэ доўга ачуньваў. Есці ж не было чаго. Нават тыя нішчымныя запасы, якія заставаліся ў схованках пасля нашага сыходу ў лес, пры адступленні выграблі немцы. Праўда, народ у вёсцы быў добразычлівы. Дапамагалі суседзі. Хто малачка прынясе, хто хлеба, хто бульбіну...

25 лютага 1944-га мяне прызвалі ў войска. Патрапіў я ў 101-ы стралковы полк, які базіраваўся тады ў Добрушы. А ў пачатку 1945-га накіравалі ў Літву, на касу Курыша-Нерунг. Па ёй уцякалі немцы з вызваленай Клайпеды. На касе знаходзілася некалькі нямецкіх фарміраванняў, якія абстрэльвалі нашы пазіцыі. І камандаванне вырашыла знішчыць гэтых фашыстаў. Нас выйшла на атаку ў роце чалавек 90. А вярнулася назад з бою жывымі ці то 10, ці то 12 чалавек... Камандзір роты, які падыходзіў мне тады ў бацькі, сказаў мне, пакуль мы ішлі на фарміровачны пункт: «Сынок, калі будуць строіць наш полк — не станавіся. Трапіш у бой і загінеш. Бачыш, колькі тут нас засталося?» Я яму: «Дык дзерцірам жа палічаць!»

Падыходзіць да мяне нейкі сяржант з усходняй знешнасцю і пытаецца на ламанай мове пра маю адукацыю. Я адказваў: маўляў, так і так, скончыў сем класаў. «Пойдзеш са мной?» — пытаецца ён у мяне. Я гляджу: у яго на адзенні саматужная, зробленая з бляшанкі артылерыйская эмблема. Я пагадзіўся. І так я патрапіў у полк зенітнай артылерыі.

Прайшоў з баямі праз усю Прыбалтыку ад Ленінграда і ажно да Інстэрбурга (цяпер — Чарняхоўск у складзе Калінінградскай вобласці Расіі. — **Аўт.**). І пасля нас перакінулі ў заходнюю Латвію. А дакладней кажучы, дзеля ліквідацыі групы арміі «Курляндыя», якая трапіла там у кацёл. Праўда, у штыкавую атаку мы ўжо не хадзілі. А прыкрывалі нашы войскі з паветра. Артылерыя наша была малакалібернай. Бліжэй за 500 метраў да фронту мы знаходзіцца не маглі, але, разам з тым, было забаронена адыходзіць ад яго лініі далей, чым на паўтара кіламетра. І там працягвалася сапраўдная вайна пасля капітуляцыі. У ноч на 9 мая ў Берліне быў падпісаны мірны дагавор, а мы працягвалі наступаць на астаткі нямецкіх ды эсэсаўскіх фарміраванняў з мясцовых жыхароў... І хоць 10 мая фашысты вывесілі белы сцяг, у баявой гатоўнасці мы стаялі яшчэ амаль два месяцы! Бо ў палон здалася толькі палова асабовага складу, як пасля аказалася. А астатнія разбыліся па непралазных гушчарах ды балотах. Многія з іх і сталі «ляснымі братамі». І па адным лавілі іх там вельмі і вельмі доўга...

...Іван Нікіфаравіч развітваецца з намі каля мясцовага кургана Славы і паціху крочыць дадому. Ваеннай выпраўцы і ўнутранаму стрыжню ветэрана можна толькі пазайздросціць. Шкада толькі, што шматлікія сведкі і ўдзельнікі тых сумных і гераічных падзей ужо нічога не змогуць расказаць маладым пра ваеннае ліхалецце. Адзін з ветэранаў адышоў у іншы свет літаральна за дзень да нашага прыезду ў Рагачоў...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Надзеі БУЖАН.

Старшыня рагачоўскай гарадской арганізацыі «Беларуская асацыяцыя былых непаўналетніх вязняў фашызму» Ала ОСІПАВА каля памятніка дзецям — ахвярам вайны, вязням Азарыцкага лагера смерці.

Ігуменскі тракт

№ 8 (66)

■ Мясціны, знітаваныя з душой

Назвы прыдумаў Днепр

Пра багатую гісторыю Лучына, што ў Рагачоўскім раёне, можна расказваць шмат. Сапраўднае багацце — мясцовыя тапонімы. Жыццё на рацэ, а тым больш такой значнай, як Днепр (некалі — Непр, Данапрас, Барысфен), набывае асаблівыя якасці, узбагачае ўяўленне і надае значнасці ўсяму, што адбываецца навокал. Праз пастаянныя стасункі людзей на рацэ са старажытных часоў узбагачалася ў тым ліку і мова, і маўленне. Таму наяўнасць ракі — гэта яшчэ і прастора для праяўлення фантазіі, трапнасці, красамоўнасці і вобразнасці мясцовых назваў. Вельмі цікавая і анамастыка лучынскіх тапонімаў:

Від з Гары — высокага берага Дняпра — уніз па цячэнні.

Закотка — затока ад Дняпра, куды вада быццам цячэ-закочваецца.

Дзевічак, Гусіны востраў — свабоднае ад кустоўя месца, дзе ў пэўны час дзеўкі-бабы выбельвалі льняныя тканіны, а ў іншы — пасвілі гусей.

Скала — раней даволі пакручасты бераг. Тут адразу пачыналася глыбіня. У гэтым месцы быў своеасаблівы чорны глей, які пры высыпанні рабіўся вельмі цвёрдым, падобным да скальных утварэнняў.

Увічча — паўночная частка лукі, месца, дзе Днепр робіць паварот на 95° на поўдзень — «увіваецца».

Жарало — па аналогіі — «адтуліна ў нечым». Пратока, якая злучае азёры *Падсёл* і *Добрае* з Дняпром.

Глінка — бераг Дняпра і невялікае возера. Можа, там калісьці капалі гліну, таму ўтварылася азярцо (ёсць жа цяпер блакітныя азёры з белымі мелавымі берагамі — дзе здабывалі мел).

Ахвосце — месца на Дняпры з адыходзячымі затокамі. На выгляд (на сучаснай карце) — рыбіны хвасты. Прычым, гэта хвасты не ўклейчыны, а вялізныя — асятровыя. У XII — XIII стст. Лучын плаціў смаленскаму епіскапу даніну — асятрамі. (Пасля таго, як былі пабудаваны плаціны, асетр ужо не мог сюды падняцца). Яшчэ слова «ахвосце» — гэта пазадкі. Але наўрад ці за 4 км лучынцы тут ачышчалі зерне. Хіба што кармілі тымі пазадкамі асятроў.

Прылаконне — магчыма, трансфармацыя ад Прылуконне. Гэта месца на Дняпры — цэнтр лукі. Ад павароту на Увіччы да павароту ў Войстрай і ўтвараецца выгляд лука — «пры луку» — Прылуконне (ці Прылаконне).

Войстрая — Днепр шукае шлях, абыходзячы перашкоды (можа, таму войстра), паварочваецца зноў на поўнач на 180°. Потым, знайшоўшы шлях, зноў паварочваецца на 180° на поўдзень, нясе свае воды да Чорнага мора. Таму далей — *Уступ* — адкуль Днепр зноў імкнецца на поўдзень, апынуўшыся ў выбраным рэчышчы. У пойме Дняпра шмат водных крыніц. Па левым беразе, больш палогім, — азёры, па правым, вышэйшым, — водныя крыніцы меншых памераў. І назвы ім дадзены ў адпаведнасці з асяроддзем.

Разладзістае (Разладдзе) — можна меркаваць аб нейкім разладзе. Ва ўсе часы падзел тэрыторый быў справай далікатнай, калі не заўсёды нешта рабілася ў згодзе.

Акошнае — водная крыніца з палогімі берагамі. Значыць, была магчымасць абкасіць траву да самай вады.

Быстрэц — працяглая водная крыніца, у якой вада не застойвалася — хутка цякла.

Выгар — невялікая крыніца.

Папоў лог — напэўна, улюбёнае месца мясцовага папа. (Царква ў Лучыне была пабудавана ў 1172 годзе смаленскім князем у гонар нараджэння сына, якога і азвалі Міхаілам — царква св. Міхаіла).

Брод — невялікая крыніца. Першая на шляху да лугу. Там была дарога і месца броду.

Прорва — невялікая, але месцамі вельмі глыбокая крыніца. Вельмі верагодна — частка ранейшага рэчышча Дняпра. Ён — «прарываўся». Ці — ад глыбіні.

Глыбокі лог — глыбокая крыніца з чыстай вадой. Там вяліся краснапёркі, якія любяць чыстую ваду.

Глухавод — у адрозненне ад іншых крыніц, у пойме Дняпра не мела злучэння з ім. Таму — *«глухая вада»*. Продкі ведалі: калі няма падпіткі ад вялікай вады — то вада «глухая», з часам яна можа спыніць сваё існаванне. Яшчэ гадоў 30 таму тут хадзілі з брадніком. Вяліся шчупак, лінь, акунь, карась, плотка. Але ўжо гадоў 15 ад гэтай крыніцы засталася толькі ўпадзіна. Значыць, вада *заглухла* — «глухая» была, продкі ведалі.

Балонне — частка поймы Дняпра, непрыдатная для сенакосу з-за балоцістасці. Пры сыходзе вады — выган для жывёлы.

Чэрня — балацянка са своеасаблівым чорным глеем, дзе некалі замочвалі тканіну для фарбавання ў чорны колер. Ужо не існуе.

Пойменныя лугі — па назвах на Дняпры і крыніцах у пойме. Ёсць самастойныя назвы *Сельскі востраў* — ён не сярод вады, толькі з двух бакоў акружаны ёй (тут паварот Дняпра на 90°), а з двух — лазой, дзе відаць упадзіна. Некалі ён быў акружаны вадой — а значыць, востраў сапраўды існаваў.

Ерышнікава (Ярышнікава) — частка лугу, якая знаходзілася адразу «пад ярам». Сам Лучын размешчаны «на яры». Потым адбываецца рэзкі спад і пачынаецца пойма Дняпра.

Штаны — назва даволі новая. Дзесьці ў 60-я гады мінулага стагоддзя асушвалі частку лугоў. І так атрымалася, што меліярацыйныя каналы і лаза — калі паглядзець зверху — нагадваюць штаны.

Сенныя — частка лугу з добрым травастоем. Сена там атрымлівалася высокай якасці.

Ханькі (Ханькаўка) — магчыма, гэта звязана з татарамі — ханствам. Вядома, што ў 1562 г. Лучын быў спалены крымскімі татарамі. Можа, тая «арда» там і раскінула свае шатры, каля якіх пасвіліся татарскія коні.

Каменнае — возера па левым беразе Дняпра, за 4 км на поўдзень ад возера Добрае, на якім знаходзілася Свяцілішча Перуна, а далей — да Каменнага ланцугом размяшчаліся селішчы. Можна меркаваць, што назва звязана з тым, што на гэтым возеры стаялі каменныя язычніцкія ідалы. Дарэчы, там вельмі чыстая вада — дно відаць.

Валочкі — невялічкае возера каля Каменнага. Дакладна можна меркаваць — ад слова «валока».

І гэта толькі назвы мясцін на Дняпры і ў яго пойме (можа, і не ўсе). Ці ж не моўнае багацце? Ці ж не поле дзейнасці для беларускай тапанімікі?

Такія ж трапныя, прыгожыя назвы маюць палі, дарогі, лесапалосы, нават няўдобіцы. І, вядома ж, назвы раёнаў у самім Лучыне, — каларытна, у адпаведнасці з адметнасцю мясцовай гаворкі. Напрыклад, тэрыторыі і вуліцы, прылеглыя да Дняпра, завуцца *Дняпершчына*. А рыба і вада не *дняпроўская*, а *дняпровая*.

Соф'я КУСЯНКОВА.
Фота аўтара

■ Карані

МУЗЕЙ СТВАРАЛІ ЎСІМ ЛІЦЭЕМ

Каб прывесці туды сваіх дзяцей

Час імкліва імчыць наперад, лад жыцця змяняецца таксама. Тыя прадметы побыту, без якіх не ўяўлялі свайго жыцця нашы бабулі і дзядулі, сёння ўжо музейныя рарытэты. У Лунінецкім ліцэі вучні і настаўнікі разам стварылі музей традыцыйнай побытавай культуры беларусаў. Прычым самі навучэнцы адзначылі, што рабілі яго для таго, «каб прывесці сюды сваіх дзяцей».

Адметнасць музея ў тым, што большасць яго экспанатаў яшчэ нядаўна знаходзілася ў хатах вяскоўцаў. Змянілася літаральна адно-два пакаленні, і вось ужо ўнукі, праўнукі не тое што не карыстаюцца той або іншай рэччу, але і не ведаюць ні яе назвы, ні як яна выглядае. Можа, менавіта таму стварэнне такога музея ўсе ўспрынялі надзвычай добра і з ахвотай падключыліся да працы. Відаць, разумелі, што, калі не захаваць тое, што ў хаце ляжыць без патрэбы, калі не зрабіць яго хаця б гісторыяй, то штосьці важнае страціць наша культура, а дзеці не будуць ведаць, як жылі іх бацькі.

Найбольш актыўна дзейнічаць пачала **настаўніца беларускай мовы Валянціна КАЗУН,** якая сёння з'яўляецца захавальніцай музея. Яна аб'яднала вучняў, настаўнікаў, тэхнічных супрацоўнікаў ліцэя, а тыя, у сваю чаргу, падключылі родных — так і атрымалася, што экспанаты збіралі літаральна з усяго Палесся.

Валянціна Казун прыгадвае, што калісьці ў памяшканні музея былі пустыя сцены з сінімі шпалерамі, часткова абадранымі. Аднак сабраліся ўсе, хто мог, і разам навялі парадак. Сцены патынкавалі. Яны набылі чысцюткі белы колер. Будучыя экспанаты перагледзелі, размеркавалі па тэматычных экспазіцыях.

Гэты ліцэй не зусім звычайны: тут вучыцца шмат вясковых дзяцей, з самых розных куточкаў раёна. Таму стварыць экспазіцыю было не надта складана, кожны мог штосьці прывезці са сваёй мясцовасці. Так і атрымалася, што ёсць тут куфры з вёсак Цна і Чучавічы, драўляныя начоўкі і маслабойка са Столінскага раёна. Сапраўдныя каменныя жорны і жлукту прывезлі з Гомельскай вобласці.

Захавальніца музея Валянціна КАЗУН паказвае, як раней прасавалі.

Бацька вучаніцы Таццяны Кацуба зрабіў тэматычны беларускі куток: ложак, печка, акно — усё ў ім адпавядае традыцыйнаму. Частку сцяны абабілі драўлянымі бярвенцамі, да столі падвесілі дзіцячую калыску, на падлогу паслалі палавік — ні даць ні ўзяць беларуская хатка.

Актыўны ўдзел у стварэнні калекцыі прымалі бацькі Валянціны Казун. Яны аб'ехалі ўсе навакольныя вёскі, сваіх родных, збіраючы прадметы для музея. Задаліся мэтай — і знайшлі кужаль. Маці напрала яго тут жа ў музеі і ў такім аўтэнтычным выглядзе пакінула ў экспазіцыі.

Ёсць рэчы, якія былі створаны спецыяльна для экспанавання. Выпускнік Мікалай Трафімовіч крыжыкам вышыў рушнік і навалачку, якія пакінуў у калекцыі (гэты хлопец калісьці перамог на рэспубліканскай алімпіядзе па хіміі, а цяпер вучыцца на трэцім курсе Медуніверсітэта ў Мінску). Штосьці вышывала маці колішняга дырэктара Мікалая Паўловіча. Рэчы рабілі ці прыносілі супрацоўнікі ліцэя, бацькі, дзеці — можна сказаць, што рабілі музей абсалютна ўсе.

Цяпер у музеі сабраны 364 экспанаты. Аднак калекцыя працягвае папаўняцца. Фізрук Віктар Казун абяцаў прынесці калыску, сплеценую з лазы. Хутка сваё месца тут знойдзе і самавар. Хаця ён і не з'яўляецца прадметам традыцыйнага побыту беларусаў, але асаблівую атмасферу створыць.

Валянціна Казун расказвае, што сучасныя вясковыя дзеці з прадметамі, сабранымі ў музеі, у паўсядзённым жыцці не сутыкаюцца:

— Праведзена газіфікацыя, таму ў многіх дамах печак няма. Некаторыя дзеці ведаюць, як яны выглядаюць, але каб пячы хлеб на паду, ды на лапаце… Ва ўсіх вочы акругляюцца ад здзіўлення: «А як на лапаце? А чаму цеста не сцякае?» Калі бачаць кросны, яны часам могуць узгадаць: «Дзесьці я такое бачыў. Можа, на гарышчы ў бабулі». Таму многіх рэчаў дзеці не ведаюць, даводзіцца ім расказваць. Ды і беларускія словы (напрыклад, «абрус») вядомыя не ўсім. Так па адным прадмеце і спосабе яго ўжывання, па кожным слоўцы вывучаем сваю культуру.

Музейныя экспанаты дапамагаюць дзецям і ў вывучэнні беларускай літаратуры. Чытаючы ў «Новай зямлі» Якуба Коласа пра Верашчаку, яны прыходзяць сюды і глядзяць, як калісьці гатавалі гэтую страву. Словы «Алесі» Янкі Купалы «Будзеш кужаль ты прасці, будзеш ткаці кросны», — таксама дапамагае зразумець музей.

Вучням філалагічнага кірунку настаўніца беларускай літаратуры часта дае заданні падрыхтаваць даклад, што такое дзяжа, як раней пяклі хлеб і іншыя. З дапамогай гэтых ведаў навучэнцы пасля самі могуць праводзіць экскурсіі ў музеі — і робяць гэта з задавальненнем. У новых дзяцей, якія прыходзяць вучыцца, музей таксама выклікае вялікую цікавасць. Яны заўсёды просяць падрабязна расказаць пра экспанаты. Калі прыязджалі госці з Вільні, вучні самі праводзілі экскурсію, спявалі і танцавалі.

Адметным было адкрыццё музея. З вялікай беленай печы, якая стаіць тут, падавалі скваркі, бліны, частавалі прысутных. З навакольных вёсак прыязджалі бабулі, якія ткалі, пралі, прасавалі з дапамогай музейных прадметаў, спявалі народныя песні і танцавалі, вучылі ўсяму дзяўчат. Прыйшоў дзядуля, які плёў лапці, вучыў хлопцаў, як рабіць кашы… Відавочна, гэта больш, чым музей, — месца, дзе ліцэісты, якія прыехалі з вёскі, могуць пазнаёміцца з традыцыйнай культурай нашай Бацькаўшчыны…

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,
фота аўтара.

Лунінецкі раён.

■ Працяг тэмы

ХТО ЗАЎВАЖЫЦЬ ПАМЫЛКУ?

З'явілася грамадская ініцыятыва, якая прапануе свой спосаб барацьбы з памылкамі на паказальніках і таблічках. Ён будзе адбывацца ў межах новага праекта «КультАсвета».

Арганізатары адзначаюць, што кожны дзень, ідучы на працу або вучобу, падчас вандровак, людзі сустракаюць таблічкі або паказальнікі, напісаныя з памылкамі. Хтосьці абураецца, але не ведае, куды скардзіцца. Іншы проста прывыкае да няграматнага напісання. Аднак такія недакладнасці цалкам вырашальныя. Стваральнікі праекта прапануюць: калі заўважылі памылку, сфатаграфаваць гэты паказальнік і даслаць здымак на электронны адрас kultasvieta@gmail.com, абавязкова ўказаўшы месцазнаходжанне таблічкі. У сваю чаргу, актывісты сфармулююць зварот і разам з фотаздымкам, а таксама каментарыем філолага дашлюць яго мясцовым уладам або кіраўніцтву ўстановы, на якой змяшчаецца такая шыльда. Пры адсутнасці рэагавання зварот будзе накіраваны ў больш высокія інстанцыі.



Такі паказальнік даслала Ганна Комар.

Праверыць, ці ёсць у вашай мясцовасці няправільныя паказальнікі, і праявіць сваю грамадскую актыўнасць арганізатары праекта прапануюць да 15 красавіка. Пазней за гэты час фотаздымкі і допісы прымацца не будуць. Самых актыўных удзельнікаў узнагародзяць каштоўнымі падарункамі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Духоўнасць

Успаміналі Георгія Каніскага

У Магілёве прайшлі VII абласныя Свята-Георгіеўскія адукацыйныя чытанні, прысвечаныя памяці гэтага Святіцеля.

Георгій Каніскі праславіўся як адзін з выдатных філосафаў, педагогаў і грамадскіх дзеячаў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. У 1755 годзе ён быў прызначаны біскупам (пазней — архіепіскапам) Магілёўскім, змагаўся за роўнасць правоў падданых Рэчы Паспалітай, якія належалі да розных канфесій. Ён адкрыў у Магілёве духоўную семінарыю і арганізаваў друкарню пры архіепіскапскім доме. У 1993 годзе Георгій Каніскі быў далучаны да ліку святых Беларускай праваслаўнай царквы.

У Георгіеўскіх чытаннях, якія праводзіліся Магілёўскай епархіяй сумесна з упраўленнем адукацыі аблвыканкама ўжо ў сёмы раз, прымалі ўдзел гісторыкі, педагогі, супрацоўнікі музеяў, святары. Яны вялі гаворку аб тым, як важна захоўваць тыя культурна-духоўныя каштоўнасці, якія засталіся нам у спадчыну. Увесь дзень у сценах абласнога ліцэя № 3, дзе адбылося мерапрыемства, працавалі выставы на духоўную і гістарычную тэматыку. Грамадскае аб'яднанне «Рускі дом» запрасіла азнаёміцца з экспазіцыяй «Вяртанне памяці. Першая сусветная вайна». Наведвальнікі змаглі пагартаць кнігі духоўнага і гістарычнага зместу, пагутарыць на тэму патрыятычнага выхавання, даведацца аб новых гістарычных знаходках.

Як адзначыў протаіерэй Андрэй Купцоў, сёння вельмі важна гаварыць аб духоўнасці, нашай самабытнасці, аб тым, што мы — беларусы. Каб не растварыцца ў свеце глабалізацыі мы не павінны забывацца пра гэта, а таксама пра тое, што чалавек — гэта самая найвялікшая каштоўнасць, вобраз і падабенства Божае.

Нэлі ЗІГУЛЯ

«СІНЕНЬКАЯ» ПРАПАЛА,

або З'еў селядца разам з асігнацыяй

На працягу стагоддзяў селядзец быў бадай адзінай рыбай, даступнай звычайнаму беларускаму селяніну. Шчыра кажучы, для многіх і селядзец быў ледзь не раскошай. Самыя бедныя куплялі не саму рыбу, а толькі «лёк» — расол, у якім захоўваліся селядцы і які ўтрымліваў іх пах. У гэты расол мачалі хлеб і так трохі разнастаілі бедную смакавую гаму.

Для людзей з сярэднім дастаткам селядзец быў абавязковай стравай пад час посту, а таксама найбольш звыклай закускай пад гарэлку. Гандлявалі імі, як і валодалі корчмамі, яўрэі, таму ў народнай свядомасці вобраз селядца шчыльна пераплятаўся з вобразам яўрэя — карчмара ці дробнага гандляра. Захавалася нямала забаўных (а часам і сумных) гісторый з народнага жыцця, звязаных з селядцамі. Вось адна з іх — анекдатычны, але зусім праўдзівы выпадак з 1820-х гадоў, пра які потым яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў памятала ўся Мінская губерня. Дунін-Марцінкевіч апісвае яго ў паэме «Вечарніцы». Лянівы і дурнаваты селянін Зміцер з Лошыцы, маёнтка графа Прушынскага, прадаў у Мінску на базары цялушку і атрымаў за яе добрыя грошы — 5-рублёвую асігнацыю, «сіненькую». У дарогу купіў селядца, «за шэляг», ды не знайшоў нічога лепшага, як пакласці яго ў тую самую кішэню, дзе ўжо ляжала «сіненькая». Па дарозе дадому ў Лошыцу, завітаўшы ў карчму ў Серабранцы, Зміцер вырашыў падсілкавацца селядцом, ну і, вядома, абмыць удалы гешэфт з цялушкай.

Зміцер за цялушку як сінюю ўзяў,
Рад торгу, у кішэню зараз улажыў,
Пасля селядца як за шэляг купіў,
Здуру, дзе бумажка, туды ж яго ўклаў.
Сіняя да мокрага селядца прыстала
Ды між зубоў Змітра разам з ім папала,
А бач як квацеркай мазгі задурэў,
Не гледзячы,
з селядцом бумажку ён з'еў.
...Галавой аб сцену б'ецца,
Валасы на сабе рве,
Рукі ломіць ды галосіць,
Рэштку сіненькай к карчмару падносіць:
«Мой жа ты бацечка!
Мой ты селязенька!
Дай, прашу, параду,
што мне тут рабіць?
Хоць ідзі тапіся — нельга далей жыць».
На што карчмар адказвае:
«Хоць кажуць людзі, што Зміцер,
Дарма, што мужык, ды на розум хітры,
А я кажу: ён дурань, і вялікі дурань!
Вот, не раўнуючы, як наш рабін Урэнь.
Як жа табе, мужык,
грошай не шанаваць,
Як з селядцом бумажку
ў кішаню хаваць?

Вось так бедны Зміцер за чаркай гарэлкі з'еў цэлую цялушку, а нам пакінуў гэты сумны, але смешны анекдот — і напамін пра шкоду п'янства, і замалёўку з жыцця Серабранкі і Лошыцы, дзе жылі людзі і да нас...

Сялянская запяканка з бульбы і селядца па-літоўску

Інгрэдыенты: *7—5 бульбін, 300 г селядца, 1 цыбуліна, 50 г сметанковага масла, 1 яйка, 2 ст. лыжкі белых сухароў.*

Спосаб прыгатавання: адвараную ў лупінах бульбу пачысціць і нашаткаваць скрылікамі. Вымачаны селядзец пачысціць і, дастаўшы косці, парэзаць на кавалкі. Цыбулю нашаткаваць, спасераваць на тлушчы і злучыць з селядцом. У пасудзіне пакласці пластамі бульбу і селядзец, зверху пакласці масла, паліць узбітым яйкам, пасыпаць белымі сухарамі і запякаць у духоўцы ці печцы 10—15 хвілін. Падаваць з квашанымі буракамі ці салёнымі агуркамі.

■ Народныя ўмельцы

САЛАМЯНАЕ СОНЕЙКА З ЗОЛАТА

Больш за дваццаць гадоў Ала Аўсяннікава займаецца саломапляценнем. Вялікія лялькі ды конікі, куфры ды скарбоначкі, нават адзенне з саломы атрымліваецца рабіць сталічнаму майстру. Сёння, на пачатку вясны, сагравае Алу Аляксандраўну яе прыгожы выраб — саламянае сонейка — сімвал радасці.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ОАО «Минскторгмаш»

г. Минск, ул. Промышленная, 22. УНП 100103798

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2014 г. (млн рублей)

АКТИВ	На конец отчетного периода	ПАССИВ	На конец отчетного периода
1. Внеоборотные активы		**3. Источники собственных средств**	
Основные средства (01,02)	1337	Уставный фонд	831
Долгосрочные финансовые вложения	625	Добавочный фонд (83)	570
ИТОГО по разделу 1	**1962**	Нераспределенная прибыль (84)	903
2. Оборотные активы			
Запасы и затраты	7	**ИТОГО по разделу 3**	**2304**
Краткосрочная дебиторская задолженность	231	**5. Расчеты**	
Краткосрочные финансовые вложения	128	Краткосрочная кредиторская задолженность	31
Денежные средства	7		
ИТОГО по разделу 2	**373**	**ИТОГО по разделу 5**	**31**
Баланс	**2335**	**Баланс**	**2335**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	За отчетный период
1. Доходы и расходы по видам деятельности	
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	288
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	278
1. Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	**10**
Прочие расходы по текущей деятельности	-290
2. Прибыль (убыток) от текущей деятельности	**-280**
3. Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	**89**
Прибыль (убыток) до налогообложения	**-191**
Налог на прибыль	1
Совокупная прибыль (убыток)	**-192**

И.о. директора Почевалова Ю.Н.

Главный бухгалтер Щербакова И.В.

На основании заключения аудитора бухгалтерская отчетность отражает достоверность финансово-хозяйственной деятельности.

ОАО «АМКОДОР-УНИМОД»

Учетный номер плательщика: **100010116**

Вид экономической деятельности:
производство общемашиностроительных узлов и деталей

Организационно-правовая форма: **ОАО**

Орган управления: ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»

Единица измерения: **млн руб.**

Адрес: **220073, г. Минск, ул. Пинская, 18**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2013 года	На 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	83 253	65 656
Нематериальные активы	120	1	1
Доходные вложения в материальные активы	130	181	246
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	181	246
Вложения в долгосрочные активы	140	318	127
Долгосрочные финансовые вложения	150	14	14
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**83 767**	**66 044**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	15 064	8 902
В том числе:			
материалы	211	10 839	5 045
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	3 975	3 488
готовая продукция и товары	214	250	369
товары отгруженные	215		
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	4 938	1 381
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	11 944	6 237
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	31 283	40 124
Прочие краткосрочные активы	280	195	180
ИТОГО по разделу II	**290**	**63 424**	**56 824**
БАЛАНС	**300**	**147 191**	**122 868**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	79 713	40 454
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	24	24
Добавочный капитал	450	7 325	4 389
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	12 888	2
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**99 950**	**44 869**
Собственный капитал и обязательства	**Код строки**	**На 31 декабря 2013 года**	**На 31 декабря 2012 года**
1	2	3	4
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	39 699	27 672
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540		-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560		2 841
ИТОГО по разделу IV	**590**	**39 699**	**30 513**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	3 000	4 000
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	4 542	43 419
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	1 655	2 225
по авансам полученным	632	263	37
по налогам и сборам	633	683	596
по социальному страхованию и обеспечению	634	309	269
по оплате труда	635	868	789
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	11	11
прочим кредиторам	638	753	39 492
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650		1
Резервы предстоящих платежей	660		66
Прочие краткосрочные обязательства	670		-
ИТОГО по разделу V	**690**	**7 542**	**47 486**
БАЛАНС	**700**	**147 191**	**122 868**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2013 года	За январь–декабрь 2012 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	128 063	97 299
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(112 993)	(83 625)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	15 070	13 674
Управленческие расходы	040	(11 765)	(8 183)
Расходы на реализацию	050	(4)	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	3 301	5 491
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1 526	1 277
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(2 417)	(1 942)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	2 410	4 826
Доходы по инвестиционной деятельности	100	13 776	1 639
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	1 399	1 486
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	3	-
проценты к получению	103	12 374	152
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		1
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(286)	(1 028)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	286	448
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		580
Доходы по финансовой деятельности	120	-	9
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	-	9
прочие доходы по финансовой деятельности	122		
Расходы по финансовой деятельности	130	(61)	(1)
В том числе:			
проценты к уплате	131		-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	22	1
прочие расходы по финансовой деятельности	133	39	
Иные доходы и расходы	140		(192)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140)	150	13 429	427
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150)	160	15 839	5 253
Налог на прибыль	170	(3 096)	(1 207)
Изменение отложенных налоговых активов	180	-	
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(3)	(2)
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200)	210	12 740	4 044
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
